СА «ЗВЯЗДОЙ» — У НОВЫМ ГОДЗЕ!

Ідзе падпіска на I паўгоддзе і I квартал 2009 года

Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

Індэкс	на 1 месяц	на 3 месяцы	на 6 месяцаў
63850 (індывідуальны)	10120	30360	60720
63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	9570	28710	57420
63858 (ведамасны)	16170	48510	97020
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	14740	44220	88440

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

24 СНЕЖНЯ 2008 г.
СЕРАДА
№ 243
(26356)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

ХРЫСЦІЯНАМ БЕЛАРУСІ, ЯКІЯ СВЯТКУЮЦЬ НАРАДЖЭННЕ ХРЫСТОВА 25 СНЕЖНЯ

Дарагія суайчыннікі!

Шчыра віншую вас з Нараджэннем Хрыстовым.

Гэта радаснае сямейнае свята, сагрэтае запаветамі любові і згоды, дорыць мільёнам людзей веру і надзею. Ціхая калядная ноч, азараная святлом Віфлеемскай зоркі, дапамагае стаць бліжэй адно да аднаго, забыць крыўды і адкрыць сэрцы насустрач дабрыні.

У такія ўрачыстыя дні асабліва праніклівa адчуваецца непарушнасць вечных евангельскіх ісцін, простых і вялікіх адначасова. Бо ў наша складанае і супярэчлівае стагоддзе чалавецтву неабходныя высокія ідэалы справядлівасці, самаахвярнасці і міласэрнасці, якія хрысціянства нясе ў свет вось ужо больш як дзве тысячы гадоў.

Няхай жыватворчая атмасфера Нараджэння Хрыстова заўсёды пануе ў вашых дамах, дапамагае захоўваць самыя галоўныя скарбы — душэўны спакой і добрае самаадчуванне дзяцей і блізкіх, узаемаразуменне, сяброўства і вернасць, уменне дараваць і цаніць жыццё.

Жадаю вам, дарагія суайчыннікі, моцнага здароўя, поспеху ва ўсіх справах і пачынаннях, вялікага шчасця і цудоўнага настрою.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

ЗАЎТРА — КАЛЯДЫ!

Фота Анатоля КЛЕЦЧУКА.

БОГ ПРЫЙШОЎ ДА НАС У ВОБРАЗЕ ЧАЛАВЕКА

Пастырскае пасланне на Нараджэнне Пана 2008 г.

Не бойцеся, я абвяшчаю вам вялікую радасць: нарадзіўся вам сёння ў горадзе Давіда Збаўца, якім ёсць Хрыстус Пан (пар. Лк 2, 10—11).

Глыбокапаважаныя браты ў святарстве, шаноўныя законнікі і законніцы, умілаваныя браты і сёстры! Гэтымі словамі, з якімі Анёл звярнуўся да пастушкоў, ад усяго сэрца вітаю вас ва ўрачыстасць Божага Нараджэння. Словы гэтыя адлюстроўваюць асноўны сэнс сённяшняга свята, бо абяцаны Богам Айцом яшчэ нашым прабацькам Адаму і Еве, прадказаны прарокамі, доўгачаканы Збаўца нарэшце прыйшоў у гэты свет — прыйшоў у вобразе звычайнага чалавека.

Вядомы сучасны ірландскі пісьменнік Сэмюэл Бэккет напісаў драму аб чаканні. Акторы як прадстаўнікі чалавецтва на тэатральнай сцэне стараюцца знайсці адказ на найбольш важныя жыццёвыя пытанні, а таксама спасцігнуць сэнс жыцця чалавека. Пры гэтым яны чакаюць нейкага прышэльца. Не ведаюць, хто гэта будзе, але чакаюць, бо спадзяюцца, што ён адкажа на іх пытанні. Аднак чаканы госць не прыходзіць, і драма завяршаецца дарэмным чаканнем... Галоўная думка гэтага твора ў тым, што без дапамогі з вышыні ў пошуку адказу на экзістэнцыйныя пытанні чалавек можа толькі дарэмна чакаць... У духоўным сэнсе драма Сэмюэля Бэккета — гэта не што іншае, як вобраз чалавека, які страціў Бога і застаўся сам-насам са сваімі праблемамі.

Доўгія тысячагоддзі чалавецтва чакала Божага госця, які змог бы адказаць на пытанні, што яго хвалявалі. Сённяшняя ноч Божага Нараджэння сведчыць пра тое, што ўжо больш не трэба чакаць. Да нас прыйшоў не проста нейкі прышэлец, не іншапланецянін, але хтосьці значна большы — прыйшоў сам Бог; прыйшоў, каб дапамагчы загубленаму ў гэтым свеце чалавеку знайсці Яго і зразумець самога сябе. Ён, які існуе спрадвеку, прыйшоў у гэты свет у канкрэтную пару, калі, як кажа святы Апостал Павел, надышла паўната часу *(пар. Гал 4, 4)*. Ён, Якога не можа агарнуць увесь Космас, нарадзіўся ў канкрэтным месцы — у невялічкім мястэчку Бэтлееме. Ён, бясконца вялікі, стаўся маленькім бездапаможным немаўлятам, каб нас зрабіць вялікімі. Ён сышоў з неба на нашую зямлю, каб нас узнесці на нябёсы. Ён стаўся падобным да людзей *(пар. Флп 2, 7)*, каб мы, абагаўляючыся Божаю ласкаю, прыпадобніліся да Яго. Ён уцелавіўся, прыняў вобраз нашага падданага цярпенню цела, каб узяць на Сябе нашыя цяжкасці *(пар. Мц 8, 17; Гал 6, 2)* і такім чынам аблегчыць іх.

Прыйсце Сына Божага ў свет стала сапраўднаю рэвалюцыяй як для самога чалавека, так і ў яго адносінах з Богам. Гледзячы чыста чалавечымі вачыма на народжанага ў беднасці Езуса, можна спытацца, а што новага Ён, які распачаў сваё жыццё ў бэтлеемскай стаенцы, а завяршыў на дрэве крыжа, прынёс у наш свет і нашае жыццё? Ён не стаў Хрыстафорам Калумбам і не адкрыў Амерыкі, не стаў Ісакам Ньютанам і не адкрыў закону сусветнага прыцягнення, не стаў Альбертам Эйнштэйнам і не адкрыў тэорыі адноснасці, не стаў вучоным з сусветным імем і не адкрыў, напрыклад, законаў тэрмаядзернай рэакцыі ці генетыкі, не стаў першым касманаўтам і не адкрыў шляхоў у бязмежны сусвет — гэты пералік можна працягваць амаль да бясконцасці.

Відавочна, што ўсе гэтыя і падобныя справы Езус пакінуў рабіць чалавеку, адорваючы яго розумам і вольнаю воляю. Але Ён зрабіў тое, чаго сам чалавек ніколі не змог бы зрабіць. Ён з'явіўся перад людзьмі як уцелаўлёны Бог, Бог з чалавечым абліччам і сэрцам. Дзякуючы гэтаму, Бог стаў блізкім чалавеку і яго патрэбам — міласэрны і ў той жа час справядлівы. Праз сваё ўцелаўленне Езус надаў сэнс жыццю чалавека і вярнуў яму годнасць Божага стварэння. Ён не ацэньвае чалавека на падставе колеру скуры, мовы, адукацыі, банкаўскага рахунку, здольнасцяў ці іншых другасных рэчаў, але робіць гэта паводле крытэрыяў нязменнай вартасці. Ён першы сказаў тое, што сённяшняя дэмакратыя любіць прыпісваць сабе, а менавіта, што чалавек — гэта не нейкая рэч і адны людзі не могуць выкарыстоўваць іншых. Такім чынам Ён падкрэсліў роўнасць усіх людзей. Дзякуючы Яму кожны чалавек з'яўляецца дзіцем Божым і братам Богачалавека, пакліканым да вечнага шчасця.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў ад Саўміна ўзважанай эканамічнай палітыкі адносна ІП і іншых груп дзелавога свету

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў ад Савета Міністраў і адпаведных структураў дзяржаўнага кіравання без сацыяльных ускладненняў і палітычнага ажыятажу праводзіць мэтанакіраваную і ўзважаную эканамічную палітыку як адносна індывідуальных прадпрымальнікаў, так і іншых групаў дзелавога свету. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў на нарадзе па пытаннях рэгулявання прадпрымальніцкай дзейнасці.

«Спасылаючыся на сусветны фінансавы крызіс, урад прапануе адтэрміноўваць прыняцце змянення ўмоў дзейнасці індывідуальных прадпрымальнікаў. Зразумела, крызіс нельга не ўлічваць. Але ў гэтай сітуацыі мяне хвалюе тое, што чарговы раз з усёй відавочнасцю выявілася поўная негатоўнасць як прадпрымальнікаў, так і ўрада цывілізаваным шляхам вырашыць даўно наспелую праблему», — падкрэсліў беларускі лідар.

Ён нагадаў, што з часу прыняцця ўказа аб мерах па рэгуляванні прадпрымальніцкай дзейнасці прайшло больш як тры з паловай гады. На думку Аляксандра Лукашэнкі, за гэты перыяд практычна нічога не зроблена для аптымальнага выраўнавання ўмоў работы суб'ектаў гаспадарання. Не выкананы даручэнні ў стварэнні галоўнага звяна — аптовых складоў у кожнай вобласці для цэнтралізаванага ўвозу тавараў. Складанай і затратнай застаецца сістэма мытнага афармлення і іншых шматлікіх працэдураў.

«Усё пушчана на самацёк, ва ўрадзе лічаць, што праблема сама сабой вырашыцца. Замест таго каб працаваць сістэмна, зноў цягнемся ў хвасце падзей, вымушаючы зноў вяртацца да тых праблемаў, якія павінны вырашацца на ўзроўні ўрада і губернатараў», — заявіў Прэзідэнт.

У Беларусі неабходна выпрацаваць аптымальныя меры для вырашэння праблемаў у сферы рэгулявання дзейнасці індывідуальных прадпрымальнікаў.

«Нам неабходна сумеснымі намаганнямі, без дагматызму і вузкаведамаснай зашоранасці выпрацаваць найбольш аптымальныя меры для вырашэння праблемаў, якія абвастрыліся апошнім часам. Прытым улічваючы як новыя сучасныя выклікі, так і дзяржаўныя інтарэсы па забеспячэнні стабілізацыі эканомікі і спакою ў грамадстве», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў ад урада справаздачу аб тым, як выконваюцца яго даручэнні па развіцці гэтага сектара малога бізнэсу.

Прэзідэнт падкрэсліў, што праблемы рэгулявання дзейнасці індывідуальных прадпрымальнікаў разглядаліся ўжо не раз. Яшчэ ў 2001 годзе быў прыняты дэкрэт № 12, якім было вызначана прававое поле для гэтага сектара эканомікі. Тады ж было адменена мытнае афармленне тавараў трэціх краін, што паступаюць з Расіі, уведзены адзіны падатак. Тым самым былі зроблены спробы вывесці з ценявога абароту дзейнасць індывідуальных прадпрымальнікаў.

«Гэта дало штуршок развіццю прадпрымальніцтва. Але затым праявіліся і некаторыя негатыўныя тэндэнцыі, у прыватнасці, стала ўзрастаць доля неарганізаванага рынку. Адрозненні ў пытаннях падаткаабкладання і спагнання мытных пошлін для часткі індывідуальных прадпрымальнікаў стварылі больш прывольныя ўмовы работы, чым для іншых», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Як лічыць Аляксандр Лукашэнка, «само жыццё патрабавала ад нас выраўнаваць гэтыя ўмовы». Асабліва востра стала гэта пытанне, калі ў гандлі з Расіяй змяніўся парадак выплаты падатку на дабаўленую вартасць. «Індывідуальныя прадпрымальнікі і ўрад аказаліся да гэтага не гатовыя», — дадаў беларускі лідар.

Прэзідэнт нагадаў таксама, што ў 2005 годзе яму давялося ўшчыльную заняцца вырашэннем праблемы і сустракацца з прадстаўнікамі малога бізнэсу. Затым былі прыняты важныя дакументы, у тым ліку ўказ № 285, у якім для часткі індывідуальных прадпрымальнікаў, якія займаюцца гандлем, быў захаваны на пэўны перыяд спрошчаны парадак увозу тавараў з тым, каб у далейшым яны перайшлі на больш высокую ступень арганізацыі бізнэсу. «Мы яшчэ раз пайшлі на ўступку прадпрымальнікам і дамовіліся, што канчатковы тэрмін увядзення роўных умоў устанаўліваецца на 1 студзеня 2009 года. У сувязі з гэтым у мяне пытанне да ўрада: як так атрымалася, што напярэдадні гэтай даты Савет Міністраў выходзіць з прынцыпова новай ініцыятывай і прапануе адтэрмінаваць прыняцце гэтых змяненняў?» — падкрэсліў Прэзідэнт.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

«ЛЮБЛЮ СВАЮ ПРАЦУ, ЛЮБЛЮ СВАЮ ДАРОГУ, ЛЮБЛЮ СВАЮ «ЗВЯЗДУ»

Вельмі часта падобныя загалоўкі прыдумляюць журналісты. Не, не падумайце, сэнс не перайначваюць, але фразы шліфуюць... А вось мне пашанцавала, загаловак для матэрыялу знайшоўся з першых слоў размовы з Марыяй Францаўнай Войцік...

У Марыі Францаўны, паштальёна аддзялення сувязі вёскі Юркаўшчына Докшыцкага раёна, якая стала галоўным прызёрам па Віцебскай вобласці, прыехаць за пыласосам у рэдакцыю ніяк не атрымоўвалася. Таму мы паабяцалі прывезці яго падчас традыцыйнай дастаўкі прызоў падпісчыкам. Так сфарміраваўся наш маршрут на Віцебшчыну: праз Докшыцы і Глыбокае на Шаркаўшчыну і Міёры.

Юркаўшчына ад Докшыц кіламетрах у 30-ці, адно з самых аддаленых аддзяленняў. Але і Марыю Войцік, і начальніцу аддзялення Марыю Крукавіч паштовае раённае начальства цудоўна ведае. Ведаюць як прафесіяналаў сваёй справы, «паштальёнаў ад Бога», супрацоўнікаў аднаго з лепшых аддзяленняў. Нам спачатку прапанавалі «не круціцца» з райцэнтра ў Юркаўшчыну, бо гэта зусім «не па маршруце», а прыз адправілі б з раніцы на паштовай машыне. Але хіба ж мы маглі пасля такіх характарыстык не паехаць, не падзякаваць за працу, не выказаць прызнанне асабіста?

Марыя Францаўна — паштальён з больш як трыццацігадовым стажам, усё жыццё адпрацавала на Юркаўшчынскай пошце. І матэрыял вельмі хацелася аздобіць здымкам гэтай прыгожай, энергічнай, з жывым ясным позіркам жанчынай, але як на ліха непаслухмяная тэхніка не захацела ўключацца. Пакуль фотаапарат бездапаможна пішчаў, я выпытвала сакрэт энергічнага працоўнага даўгалецця Марыі Войцік.

— Ну якія сакрэты, я проста люблю сваю працу, люблю сваю дарогу, люблю сваё ўсё... люблю сваю «Звязду».

Вось так больш за 35 гадоў з дня ў дзень, з любоўю ў сэрцы заходзіць да сваіх падпісчыкаў Марыя Францаўна. Прыносіць газеты, навіны, пенсіі, паштоўкі, таварыш...

(Заканчэнне на 4-й стар.)

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

АДНО ДЗІЦЯ — УЖО НЕ АКТУАЛЬНА?

Беларусы паступова адыходзяць ад варыянту «адна сям'я — адно дзіця». У прыватнасці, як паведаміла прэс-сакратар Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Галіна Трафіменка, апошнім часам у сем'ях краіны на 11,3 працэнта павялічылася колькасць другіх, і на 15,4 працэнта — трэціх нараджэнняў.

Пры гэтым летась у сярэднім на адну жанчыну рэпрадукцыйнага ўзросту прыпадала 1,373 нараджэння. Для параўнання: у 2006 годзе такі паказчык складаў 1,287. Дарэчы, адзначыла Галіна Трафіменка, павелічэнне сумарнага каэфіцыента нараджальнасці дае свой вынік. Летась, упершыню з сярэдзіны 1990-х, Беларусь пераўзышла 100-тысячную мяжу — у краіне нарадзілася 103 626 дзяцей.

Сяргей ГРЫБ.

«КАЗКІ НАРОДАЎ СВЕТУ» ПАПОЎНІЛА НОВАЯ МАНЕТА

Нацыянальны банк з сённяшняга дня выпускае ў абарачэнне дзве новыя памятныя манеты — «Фінансавая сістэма Беларусі. 90 год» і «Турандот» серыі «Казкі народаў свету», паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар галоўнага банка краіны Міхаіл Журавовіч.

Першая манета — сярэбраная — мае намінал 20 рублёў, пробу сплаву 925 і масу 33,63 г, медна-нікелевая — намінал 1 рубель. Яны адчаканены на АТ «Манетны двор Польшчы»: сярэбраная якасцю «пруф», медна-нікелевая — «пруф-лайк». Абедзве манеты выпушчаны тыражом па 3000 штук кожная. Памятная сярэбраная манета «Турандот» намінаам 20 рублёў мае пробу сплаву 925, масу 28,28 г. На адваротным баку гэтай манеты справа ўверсе — устажка круглай формы з цыркону ярка-аранжавага колеру. Яна адчаканена таксама на «Манетным двары Польшчы» якасцю «анцыркулейтэд». Паверхня манет аксідзіраваная, тыраж — да 25 тысяч штук.

Ігар ГРЫШЫН.

ПРАДПРЫМАЛЬНІК ПАЗБАВІЎСЯ СТРАХУ?

Мяркуючы па ўсім, гэта так. Бо нарэшце звярнуўся ў міліцыю, і там адрэагавалі наступным чынам: зламысніка змясцілі ў ізалятар — за тое што «ўзяў на курок» індывідуальнага прадпрымальніка і прымусіў яго плаціць штомесяц яму за гандаль на рынку па дзесяць долараў за «прыкрыццё» ад крымінальных элементаў.

Той паспрабаваў адмаўляцца, а ў адказ — пагрозы: будзе знічана ўся яго маёмасць. Прадпрымальнік колькі разоў плаціў яму, а потым, падумаўшы, вырашыў наогул прыпыніць сваю дзейнасць. Што і зрабіў. Цяпер жа ён асмялеў і зрабіў правільны ход.

ВЫПАЎ З КАТЭРА, ТРАПІЎ ПАД ДРЭВА

І ў абодвух выпадках — загінулі два чалавекі. Матарыст-рулявы выратавальнага катэра, 1961 года нараджэння, які працаваў на паромнай пераправе цераз Прыпяць у Петрыкаўскім раёне, і 36-гадовы жыхар гэтага ж раёна, які займаўся нарыхтоўкай дроваў у лесе. Першы выпаў з катэра і патануў, а другі памёр у бальніцы пасля таго як на яго звалілася дрэва.

ГАРМАТА, ВЯДОМА, БУХНУЛА Б...

Пры дзвюх умовах. Калі б яе дэталёва не агледзелі ў Хойніках у філіяле РУП «Гомельдругмет» і калі б тое самае (пасля ўжо) не зрабілі на прадпрыемстве, дзе яе разрэзалі, каб адправіць на пераплаўку. Справа ў тым, што ў гармаце знаходзіўся зараджаны снарад. Спецыялісты-сапёры абязшкодзілі яго.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЧУБАЙС ПРАДКАЗВАЕ ЎВЕСНУ САЦЫЯЛЬНЫ КРЫЗІС

Анатоль Чубайс, кіраўнік дзяржкарпарацыі «Раснана», у мінулым — міністр фінансаў і першы віцэ-прэм'ер расійскага ўрада, заявіў у інтэрв'ю The New Times, што маштаб удару беспрэцэдэнтны: яго не параўнаць ні з абвалам 91-га, ні з дэфолтам 98-га.

Фінансавы крызіс, здаецца, мінуў, сцвярджае былы віцэ-прэм'ер, банкаўская сістэма выстаяла. Разгортваецца крызіс эканамічны: «Ён непазбежны, ён сапраўды будзе. Эканамічны будзе пераходзіць у сацыяльны роўна ўвесну. Ці будзе сацыяльны пераходзіць у палітычны — гэта ўжо пытанне трываласці той сістэмы, што была выбудаваная за апошнія 8 гадоў», — рэзюмаваў Чубайс.

У ЛІТВЕ ЗБІРАЮЦЦА АБКЛАСЦІ ПАДАТКАМ УСІХ АЎТАЎЛАДАЛЬНІКАЎ

Урад Літвы плануе ўвесці падатак на аўтамабілі — яго будуць спаганяць як з юрыдычных, так і з фізічных асобаў. Пра гэта заявіў прэм'ер-міністр рэспублікі Андрюс Кубілюс.

Заява была зроблена ў парламенце 23 снежня. Дэпутаты, як паведамляецца, прымалі закон аб уводзінах часовага падатку на аўтамашыны, прыналежныя юрыдычным асобам.

Паводле словаў Кубілюса, прыватных аўтаўладальнікаў могуць абкласці падаткам ужо ў другой палове 2009 года. Міністр транспарту Элігіюс Масюліс, да якога агенцтва звярнулася па каментарыі, заявіў, што пакуль невядома, па якім прынцыпе будзе спаганяцца новы падатак — у залежнасці ад узросту аўтамабіля або ад аб'ёму выхлапных газаў.

Як паведамлялася раней, у выніку паправак у падатковае заканадаўства Літвы за аўтамабіль, зарэгістраваны на юрыдычную асобу, уладальніку давядзецца плаціць 150 літаў (каля 60 долараў) у месяц. Улады рэспублікі разлічваюць, што новаўвядзенне прынясе бюджэту 300 мільёнаў літаў (каля 121 мільёна долараў) у год. Гэтыя планы выклікалі незадаволенасць прадпрымальнікаў, у прыватнасці прадстаўнікоў таксаматорных кампаній. Улічваючы, што з новага года таксама павышаецца акцыз на паліва, ім пагражае банкруцтва.

У КІРГІЗІІ ПЛАНУЮЦЬ УЗАКОНІЦЬ ВОДКУП АД АРМІІ

Міністэрства абароны Кіргізіі прапанавала ўзаконіць водкуп ад абавязковай ваеннай службы. Адпаведнае палажэнне ўтрымліваецца ў новай рэдакцыі Закона «Аб усеагульным воінскім абавязку», прадстаўленай у парламенце 22 снежня.

Калі законапраект будзе прыняты, у Кіргізіі з'явіцца адмысловы выгляд службы — ПМР (прызыўны мабілізацыйны рэзерв). Прызыўнік, які захоча скарыстацца новаўвядзеннем, павінен будзе ўнесці на адмысловы рахунак Міністэрства абароны 12 тысяч самоў (каля 300 долараў), а таксама прайсці падрыхтоўку ў вучэбна-трэніравальным цэнтры.

Паводле словаў міністра абароны Бакытбека Калыева, вучоба будзе працягвацца на працягу месяца. Пасля гэтага малады чалавек зможа атрымаць ваенны білет.

Фота Анатоля КЛЕЦЧУКА.

«Дзед Мароз, зрабі здаровай!»

Для двухгадовай **Дар'і ЧАРНЮК** (на фотаздымку), як і для ўсіх пацыентаў Рэспубліканскага дзіцячага анкалагічна-гематалагічнага навукова-практычнага цэнтра ўчарашні дзень стаў навагодне-казачным. Дзед Мароз хадзіў па палатах і раздаваў падарункі кожным хлопчыку і дзяўчынцы. Для дзяцей быў арганізаваны дабрачынны канцэрт зорак беларускай эстрады і цыркавы паказ. Дактары і бацькі шчыра вераць, што пераднавагоднія эмоцыі спрыяюць хутчэйшай папраўцы хворых дзяцей.

НА ХУТАРЫ?

Мінсельгасхарч прапрацоўвае пытанне аб стварэнні ў сельскай мясцовасці хутароў, паведаміла першы намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Надзея КАТКАВЕЦ.

Неабходна вывучыць грамадскую думку беларусаў, іх стаўленне да стварэння хутароў. Калісьці гэта быў даволі развіты кірунак сельскага ўкладу, ладу жыцця людзей. З цягам часу, улічваючы ўсе абставіны, уключна калектывізацыю, ваенныя дзеянні падчас Вялікай Айчыннай вайны, гэты кірунак зведаў сур'ёзныя змены. І сёння ў Беларусі па статыстыцы няма ніводнага населенага пункта, які б называўся хутарам.

«Мы хочам вывучыць настрой людзей, наколькі ў іх ёсць жаданне самастойна займацца сельскай гаспадаркай, рамяством або займацца экалагічным турызмам, каб для гэтага можна было б нейкім чынам афарміць сваё пражыванне на хутары і юрыдычна афарміць свой населены пункт, які складаецца з адной сядзібы, як хутар. Нам хацелася б вярнуцца да пытання стварэння хутароў яшчэ і таму, што мы разлічваем на людзей, на іх мудрасць і разважлівасць. Яны заўсёды знойдуць шляхі вырашэння любой цяжкай задачы, і ў гэтым выпадку — таксама», — сказала Надзея Каткавец.

Безумоўна, сучасны хутар будзе істотна адрознівацца ад ранейшага. Як бы далёка ні знаходзілася сядзіба хутараніна ад сельскагаспадарчага кааператыва, да яго абавязкова правядуць дарогу, ЛЭП.

(Заканчэнне на 5-й стар.)

Хутар каля вёскі Лоск Валожынскага раёна.

Фота Анатоля КЛЕЦЧУКА.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 08243

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.12.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 200,00
1 еўра	3 073,84
1 латвійскі лат	4 356,87
1 літоўскі літ	889,72
1 чэшская крона	116,87
1 польскі злоты	746,32
1 расійскі рубель	77,64
1 украінская грыўня	274,14

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	28,3359
10 UAH	35,7551
1000 BYR	12,8741
EUR	39,6674

Курс у гандлёвых кампаніях (на 23.12.2008 г.)

USD	2250 / 2300

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Прамая лінія

ДАЛОЎ КАМЯНІ... І ЦЫСТЫТ, І ПРАСТАТЫТ

Калі трэба звяртацца да ўролага? Зразумела, гэту падказку можа даць тэрапеўт. Тым не менш, лепей за ўсё і самому ведаць некалькі элементарных рэчаў. Незалежна ад палавой прыналежнасці кансультацыя ўролага неабходная, калі ўзнікла праблема з мочаспусканнем, змяніліся аналізы мачы, з'явіўся боль у паясніцы або ўльтрагук выявіў пэўныя змены ў нырках. Для мужчын ва ўзросце да 50 гадоў характэрнае такое захворванне як прастатыт, а адэнома прастаты — для асобаў больш сталага ўзросту. І з першай, і з другой праблемай можна, як кажуць, жыць. Тым не менш як толькі вы, шаноўныя мужчыны, заўважылі, што вам ёсць на што паскардзіцца доктару, схадзіце да яго і раскажыце аб непрыемных сімптомах. І не спрабуйце займацца самалячэннем. Аднаразовы прыём нават самага разрэкламаванага лекавага прэпарата не прынясе вам палёгкі. Працэс нармалізацыі стану пры згаданых хваробах бывае вельмі і вельмі доўгім, а станоўчы эфект залежыць ад шэрагу момантаў. Жанчыны часцей пакутуюць ад запаленняў, мочакаменнай хваробы і нетрымання мачы. Што да апошняга, то кожная другая жанчына пасля 50 гадоў мае праблемы з расстройствам мочаспускання. Некаторым пацыенткам патрабуецца нават хірургічнае ўмяшанне. Не спадзявайцеся, паважаныя жанчыны, на тое, што з цягам часу ўсё само сабой неяк знікне, — спытайце ў доктара аб сучасных метадах аказання ўралагічнай дапамогі.

А карысныя падказкі ўсім, хто дазваніўся на нашу медыцынскую «прамую лінію», даў кіраўнік цэнтра ўралогіі г. Мінска, загадчык кафедры ўралогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, доктар медыцынскіх навук, прафесар Аляксандр СТРОЦКІ.

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

☎ — Ігар Фёдаравіч са Стоўбцаў. Мяне цікавіць лячэнне нетрымання мачы...

— Яно бывае розным... Калі вы заўважылі праблему?

— Даўно.

— У мяне ёсць сумненні, што менавіта спецыяліст паставіў такі дыягназ, а не вы самі зрабілі гэта за яго. Вам трэба звярнуцца да раённага, а калі спатрэбіцца, дык і да абласнога ўролага, і абавязкова абследавацца, таму што ёсць розныя тыпы нетрымання мачы, і лечацца яны па-рознаму. Перш-наперш трэба дакладна высветліць, што ў вас — нетрыманне ці неўтрыманне мачы. Гэта абсалютна розныя рэчы, і пацыенты часам самі не здольныя гэта адрозніць...

☎ — Алена, Асіповічы. 67 гадоў. Жоўцевы пузыр забіты камянямі памерам да 12 мм. Ёсць камяні і ў пратоках. Ці патрэбна тут хірургічнае ўмяшанне або можна абысціся народнымі сродкамі?

— У вас жоўцекаменная хвароба, а я лячу камяні ў мачавых шляхах. Тым не менш магу дакладна вам сказаць, што ў такой сітуацыі ніякімі народнымі сродкамі не дапамагчы. Неабходна наважыцца, пад'ехаць да хірурга і вырашыць гэту праблему.

— Адны кажуць — выдаляць, а другія — можна не спяшацца.

— Я вам выказаў сваё меркаванне. Паразмаўляйце са спецыялістам, і гэта будзе больш правільна.

Святлана БАРЫСЕНКА
і Вольга ШАЎКО.
(Працяг будзе.)

з дапамогай аднаразовага прымянення мануралу?

— Манурал — добры дзейсны антыбіётык. Ці патрэбны ён менавіта вам — іншае пытанне. Цыстыт ён можна вылечыць толькі ў тым выпадку, калі гаворка ідзе пра востры, а не хранічны працэс. У вашым жа ўзросце наўрад ці можа быць не ўскладнены цыстыт. Хутчэй за ўсё, вы пакутуеце ад праблемы не першы дзень. Значыць, гаворка ідзе пра хранічны цыстыт. Таму трэба спачатку абследавацца ва ўролага, які возьме пад увагу вынікі вашых аналізаў і частату абвастрэнняў на працягу года. Аналіз мачы пакажа мікроб, які выклікае праблему, дазволіць меркаваць, да якіх лекаў ён адчувальны... Толькі пасля гэтага можна вырашаць, які антыбіётык вам можна ўжываць і ці патрэбны ён вам увогуле. У некаторых выпадках лячэнне праводзіцца без удзелу антыбіётыкаў. Любыя лекі, у тым ліку вышэйпамянёную групу, прызначаць сабе самастойна, мякка кажучы, не карэктна.

— У мяне ёсць яшчэ два невялікія камяні ў нырках. Прайшла ў свой час курс лячэння. Але яны не выйшлі. Верагодна, трэба зноў рабіць ультрагук... А можа вы падкажаце, якія народныя сродкі дапамогуць у гэтай сітуацыі?

— Безумоўна, трэба зноў рабіць ультрагукавое даследаванне. Неабходна ўдакладніць, ці ёсць усё ж такі зараз камяні, калі ёсць, то якіх памераў... Тое, што камяні, як вы кажаце, не выйшлі, не азначае, што лячэнне было неэфектыўным. Магчыма, удалося спыніць іх рост... Калі пад народнымі сродкамі разумець травы, то іх прыём можа дапамагчы ў лячэнні мочакаменнай хваробы.

☎ — Алена, Асіповічы. 67 гадоў. Жоўцевы пузыр забіты камянямі памерам да 12 мм. Ёсць камяні і ў пратоках. Ці патрэбна тут хірургічнае ўмяшанне або можна абысціся народнымі сродкамі?

— У вас жоўцекаменная хвароба, а я лячу камяні ў мачавых шляхах. Тым не менш магу дакладна вам сказаць, што ў такой сітуацыі ніякімі народнымі сродкамі не дапамагчы. Неабходна наважыцца, пад'ехаць да хірурга і вырашыць гэту праблему.

— Адны кажуць — выдаляць, а другія — можна не спяшацца.

— Я вам выказаў сваё меркаванне. Паразмаўляйце са спецыялістам, і гэта будзе больш правільна.

Святлана БАРЫСЕНКА
і Вольга ШАЎКО.
(Працяг будзе.)

БОГ ПРЫЙШОЎ ДА НАС У ВОБРАЗЕ ЧАЛАВЕКА

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

Таму кожны чалавек мае не толькі свой адзіны і непаўторны генетычны код, але і звышнатуральную каштоўнасць і годнасць адкупленага дзіцяці Божага. Вельмі добра гэтую праўду выяўлялі першыя хрысціяне, якія не толькі абвяшчалі сваім жыццём Евангелле, але прадусім жылі ім. Менавіта яны гаварылі: «Бачыш брата — значыць бачыш Бога». Калі язычніцкі Рым пакінуў пасля сябе прыказку: «Чалавек чалавеку — воўк», то Хрыстус у сваім Евангеллі заклікае да таго, каб чалавек чалавеку быў братам.

Яшчэ ў XVII стагоддзі вялікі французскі мысліцель Блез Паскаль пісаў, што без Хрыста чалавек не ведае, чым ёсць жыццё і смерць, кім ёсць Бог і кім — ён сам. Нездарма Слуга Божы Ян Павел II казаў, што чалавек можа зразумець сябе толькі ў Хрысце. Рэвалюцыя Езуса Хрыста ў тым і заключаецца, што Ён нам адкрыў, кім з'яўляецца Бог, бо Бога ніхто ніколі не бачыў, і толькі адзінародны Сын Яго аб'явіў *(пар. Ян 1, 18)*. Ён паказаў чалавеку, кім ёсць чалавек і ў чым сэнс чалавечага жыцця, цярпення і смерці. Ён сказаў чалавеку, дзеля чаго ён жыве і што яго чакае ў вечнасці.

Езус — гэта Эмануэль — Бог з намі, Бог у нашай чалавечай прыродзе, у нашай чалавечай гісторыі, у нашым жыцці — вось тыя вялікія праўды, вось тая рэвалюцыя, якую зрабіў Езус. Здзейснілася мара чалавека сваімі вачыма ўбачыць Бога-Збаўцу.

Кардынал Ёзаф Ратцынгер — сённяшні Папа Бэнэдыкт XVI — падкрэслівае, што хрысціянская вера накіроўвае нас да Бога як чалавека. Гэтым самым яна нібы перакідвае мост паміж вечным і часовым, бачным і нябачным і дае нам магчымасць сустрэцца з Богам як з чалавекам, сустрэцца з вечным, як з часовым, сустрэцца, як з адным з нас. Дзякуючы Богаўцелаўленню вера прыносіць вечнае ў наш свет. Той каго ніхто і ніколі не бачыў, стаўся адкрытым для нашых вачэй, для дотыку нашых рук: дастаткова зрабіць толькі два-тры крокі насустрач таму Чалавеку з Палестыны. Бог адкрываецца чалавеку праз Езуса Хрыста, у якім канчаткова сябе праяўляе чалавечае быццё і які адначасова з'яўляецца Богам. Такім чынам, Сын Божы — гэта цэнтр і сэнс усёй чалавечай гісторыі.

У гістарычны момант прыйсця Хрыста ў свет для Яго не знайшлося месца ў аніводным доме *(пар. Лк 2, 7)*. Не прынялі Яго свае, хоць найперш прыйшоў да іх *(пар. Ян 11, 11)*. А сёння? Як ёсць сёння? Як ёсць у маім і тваім, дарагі браце, дарагая сястра, жыцці?

Езус і сёння стукаецца ў дзверы нашых сэрцаў. Ён хоча ўвайсці і зрабіць у іх духоўную рэвалюцыю, бо як жа шмат людзей сёння жыве так, як быццам Бога зусім няма, або згадваюць пра Яго толькі на Божае Нараджэнне ці на Вялікдзень! Як жа шмат людзей сёння не хочуць ісці ў касцёл, каб толькі не сустрэць там жывога Хрыста! Як жа шмат выпаленых сухавеем секулярызму, маральнага рэлятывізму і ліберальнай ілжээтыкі душаў, якія не падаюць ужо й прыкметаў духоўнага жыцця, у якіх не растуць гаючыя плады Божай ласкі. Так шмат забарыкадаваных ад Езуса сэрцаў з-за боязі, каб Ён толькі не ўвайшоў і не разварушыў сумлення, бо чалавек хоць і ведае, што з'яўляецца духоўна хворым, але пры гэтым свядома не жадае лячыцца.

Сучасны чалавек знайшоў шлях у космас, быў на Месяцы, даследуе Марс і іншыя планеты, будуе міжнародныя касмічныя станцыі і пакрысе ўваходзіць у эпоху касмічнага турызму, усур'ёз задумваецца пра пабудову касмічных гарадоў і нават пра прамысловую дзейнасць у космасе. Дзякуючы інтэрнэту ён ператварыў нашу вялікую планету быццам бы ў маленькую вёсачку, дзе ў імгненне вока ўсё і ўсім становіцца вядома. Дасягненні навукі так захапляюць і вабяць, што здаецца, вось-вось чалавек не толькі зможа вырашыць усе праблемы, але ва ўсім стане самадастатковым. Аднак у той самы час простым вокам відаць, што чалавек згубіў шлях да Бога, а таму ў час нябачанага дагэтуль прагрэсу і эканамічнага развіцця ён жыве ў пастаянным страху і непакоі за сваю будучыню.

Пацвярджае гэта і выбух фінансавага крызісу, што ў апошні час ахапіў увесь свет. Прычына крызісу крыецца перадусім у пазбаўленай маральнага і чыста чалавечага вымярэння банкаўскай і эканамічнай дзейнасці, якая скіравана на немаральнае выкарыстанне фінансавых сродкаў і імкненне абагаціцца за кошт іншых. Гісторыя яшчэ раз паказала, што трывалым фундаментам нашага жыцця з'яўляецца Бог і Ягоная праўда, а не матэрыяльныя каштоўнасці.

Мы радуемся, што нашыя касцёлы сёння поўныя, што ў іх шмат людзей, што дзеці з захапленнем падыходзяць да яселак, што адбываюцца батлейкі і мы весела спяваем калядкі. Але для сапраўднага перажывання Божага Нараджэння гэтага крыху замала. Езус павінен нарадзіцца сваёю ласкаю ў нашых душах, каб яны сталі Бэтлеемам нашага часу. Сын Божы нам дадзены не проста як гістарычная асоба, але як Той, хто заўсёды прыходзіць. Трэба Яго толькі прыняць, дакрануцца да Яго, каб па-сапраўднаму перажыць гэтае збаўчае свята.

Езус прыходзіць да нас у сакрамэнтах і Божым слове. Пра гэта варта ўзгадаць асабліва цяпер, калі мы разам з усім паўсюдным Касцёлам адзначаем Год святога апостала Паўла, які нястомна абвяшчаў Божае слова язычнікам, вераць ў тое, што яно — гэта сам Езус Хрыстус, Бог і чалавек.

Ад усяго сэрца віншую вас, браты і сёстры, а таксама ўсіх людзей добрай волі з урачыстасцю Нараджэння Пана!

Віншую вернікаў іншых хрысціянскіх канфесій, асабліва братняй Праваслаўнай Царквы. Езус прыйшоў да ўсіх людзей, і ўсе мы, хоць і належым да розных хрысціянскіх супольнасцяў, верым у аднаго Збаўцу, які нарадзіўся з Панны Марыі ў Бэтлееме, і вызнаем тую самую веру ў Богаўцелаўленне. Наша супольнае імя — хрысціянін — паходзіць ад Хрыста — нашага Збаўцы. Таму і наша вера і радасць — супольныя.

Перад небяспечнымі выклікамі сучаснасці мы яшчэ мацней павінны з'яднацца ў супольным вызнанні нашай веры, каб своечасова і годна на іх адказаць і тым самым будаваць нашу будучыню на каштоўнасцях Евангелля.

Жадаю вам радасці ў нованароджаным Месіі! Няхай Ён сваёю ласкаю заўсёды нараджаецца ў нашых сэрцах. Не трэба баяцца, бо сёння нарадзіўся нам Збаўца *(пар. Лк 2, 11)*, які ёсць Бог з намі *(пар. Мц 1, 23)* — наша радасць, надзея і збаўленне!

Дзяўраючы ўсіх вас апецы Багародзіцы Марыі, якая дала свету Збаўцу Езуса Хрыста, ад усяго сэрца благаслаўляю ў імя Айца, і Сына і Духа Святога. Амэн.

Арцыбіскуп
Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ
Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі

У МІНСКУ НА ЖАНЧЫНУ ЎПАЛА ДРЭВА

Дрэва ўпала на жанчыну ў дварэ дома па вуліцы Адоеўскага. Як паведаміў прэс-сакратар Мінскага гарадскога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Аляксандр Лапанік, прычынай надзвычайнага здарэння стала наліпанне на крону дрэва вялікай колькасці снегу. Жанчыну з закрытай траўмай грудной клеткі, пераломам рэбраў і сцягна даставілі ў бальніцу, дзе ёй была аказана медыцынская дапамога. Стан пацярпелай здавальняючы, пагрозы для жыцця няма.

Андрэй ШМЫГІН, «Мінск—Навіны».

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне старшыні Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Паўлаву Міхаілу Якаўлевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.

Рэдакцыя газеты «Звязда» выказвае глыбокае спачуванне старшыні Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Паўлаву Міхаілу Якаўлевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.

ЗНІКЛАГА ЗНАЙШЛІ... Ў ДЗІЦЯЧЫМ САДКУ

Больш за пяць гадоў лёс 46-гадовага мінчаніна, якога расшуквалі як зніклага без вестак, заставаўся невядомым.

Толькі цяпер праваахоўнікам удалося ўстанавіць акалічнасці крымінальнага здарэння, якое адбылося ўвечары 15 ліпеня 2003 года на тэрыторыі аднаго са сталічных дзіцячых садкоў. Як высветлілася, тады ў будынку садка з няшчасным з дапамогай сякеры расправіўся 36-гадовы сталічны жыхар: зрабіў ён гэта з карыслівых мэтаў. А цела схаваў... на тэрыторыі дзіцячага садка — закапаў.

Ігар ГРЫШЫН.

АРЭНДА «АДГУКНУЛАСЯ» ІСТОТНЫМ ПАТАННЕННЕМ

Як «Звязда» паведамляла раней, прыкладна некалькі месяцаў таму кошт арэнды кватэр у Кіеве знізіўся на 10—15 працэнтаў. У Беларусі на той час арэндныя цэннікі заставаліся на ранейшым узроўні, калі аднапакаёвыя кватэры здаваліся прыкладна за 300 долараў. Сёння арэнда жылля ў сталіцы Украіны «звалілася» ўжо на 30—50 працэнтаў. Сусветныя фінансавыя праблемы цяпер закранулі рынак арэнды жылых памяшканняў і Мінска.

Кошт аднапакаёвак знізіўся на 50 USD

Паводле інфармацыі начальніка аддзела арэнды жылля сталічнага агенцтва «Час пік» Сяргея Кадолы, попыт на мінскія кватэры за апошні месяц істотна знізіўся. Нягледзячы на гэта, гаспадары стандартных аднапакаёвых кватэр яшчэ два тыдні таму спрабавалі здаць сваю жылплёвую нерухомасць за 300 долараў. Аднак патэнцыяльныя кватаранты пачалі больш скрупулёзна лічыць свае расходы, што адразу «адгукнулася» на цэннікаў арэнды.

Зніжэнне ўжо адбылося. Сёння аднапакаёвыя кватэры ў Малінаўцы, Чыжоўцы, Сухараве і Лошыцы ўжо магчыма адшукаць за 250 долараў, а ў Шабанах нават за 200. Сярэдні кошт двухпакаёвых кватэр усталяваўся на ўзроўні 350 долараў плюс квартплата, або 300 долараў і перадаплата за 3 месяцы. За 300 долараў здаюцца ўвогуле пустыя дзвюхпакаёўкі ў новых мікрараёнах.

Кошт арэнды трохпакаёвых кватэр складае 400 долараў, або 350 USD плюс аплата камунальных паслуг.

Прапанова вялікіх кватэр будзе павялічвацца

Ужо цяпер агульная прапанова ўсіх відаў кватэр перавышае попыт. Агенцтвы нерухомасці прапануюць сваім кліентам больш за дзесяць варыянтаў па кожным сегменце арэнднага жылля. Прыкметай апошняга часу стала выстаўленне на рынак арэнды кватэр вялікіх плошчаў па кошце звычайных «хрушчовак». Здаваць такое жыллё становіцца праблематычным, бо кватарантам прапануецца аплачваць яшчэ і камунальныя паслугі, якія сталі істотна павялічвацца.

Як і раней, пры здачы кватэр гаспадары аддаюць перавагу сем'ям. Разам з тым, сёння двухпакаёвыя кватэры з агульнай плошчай каля 70 квадратных метраў за 400—450 долараў могуць зняць толькі студэнты. У такой вялікай кватэры могуць жыць адразу 3—4 чалавекі.

Арэнда будзе таннець і надалей

Спецыялісты агенцтваў нерухомасці адзначаюць, што ў лютым і ў звычайныя гады на рынку арэнды назіраўся «мёртвы» сезон мінімальнага попыту. Эксперты не выключаюць, што крызіс попыту на стандартнае арэнднае жыллё ў апошні месяц зімы моцна паўплывае на кошт арэнды. Па самых сціплых прагнозах спецыялістаў сталічнага агенцтва «Час пік», ужо ў другой палове лютага арэнда аднапакаёвых кватэр будзе каштаваць не больш за 200 долараў.

Сяргей КУРКАЧ.

ЦІ АПРАЎДАЎ СВАЕ ЗАДАЧЫ ГОД ЗДАРОЎЯ?

Паводле звестак сацыялагічных даследаванняў, пры адназначна станоўчым стаўленні беларусаў да здаровага ладу жыцця толькі 10—15 працэнтаў насельніцтва выкарыстоўваюць на практыцы рэкамендацыі спецыялістаў па захаванні і ўмацаванні ўласнага здароўя. А ў рангу найбольш актуальных жыццёвых каштоўнасцяў, такіх, напрыклад, як заможнасць, адукацыя, становішча ў грамадстве і іншых, здароўе займае ў нашых людзей, на жаль, пакуль толькі 8-е месца. Ці варта казаць, якое важнае значэнне надавалася правядзенню ў Беларусі Года здароўя, аб'яўленага кіраўніком нашай дзяржавы. З якімі ж, цікаўна, вынікамі мы прыйшлі на яго фінішную прамую? Аб гэтым на сустрэчы з журналістамі ў Нацыянальным прэс-цэнтры расказаў міністр аховы здароўя краіны Васіль ЖАРКО.

— За 11 месяцаў гэтага года дыспансэрызацыю прайшлі ў Беларусі ўжо 7 млн 361 тысяча чалавек, або 92 працэнты дарослага насельніцтва, — падкрэсліў кіраўнік медыцынскай галіны. — У 48 працэнтаў тых, хто прайшоў поўны «тэхагляд» свайго арганізма, упершыню былі выяўлены тыя ці іншыя захворванні. Сярод дзяцей і падлеткаў дыспансэрызацыяй ахоплена 98 працэнтаў ад агульнага кантынгенту.

Васіль Жарко падкрэсліў, што за апошнія два гады сярэдняя чаканая працягласць жыцця беларусаў павялічылася на два гады — з 68 да 70,3 года. У беларускіх мужчын гэты паказчык складае 64 гады і 76 гадоў — у жанчын. Такім чынам, паранейшаму захоўваецца даволі вялікая (у 12 гадоў) розніца ў працягласці жыцця жаночага і мужчынскага насельніцтва, нехарактэрная для развітых еўрапейскіх краін.

Дзякуючы зладжаным дзеянням усіх медыцынскіх структур за 11 месяцаў гэтага года колькасць смяротных выпадкаў ад захворванняў органаў дыхання зменшылася на 18 працэнтаў, ад інфекцыйных і паразітарных захворванняў — на 11 працэнтаў, ад захворванняў сардэчна-сасудзістай сістэмы — на 1,5 працэнта, ад цэрэбраваскулярных захворванняў — на 5 працэнтаў і ад знешніх прычын — на 1,2 працэнта. Паказчык смяротнасці сёлета застаўся на ранейшым узроўні — 13,8 выпадка на тысячу насельніцтва. Затое нараджальнасць павялічылася і склала 11,2 на тысячу насельніцтва (у 2007 годзе была 10,8).

Як зазначыў Васіль Жарко, за студзень—лістапад у краіне было зроблена 8200 высокатэхналагічных аперацый на сэрцы і сасудах, у тым ліку кардыяхірургічных — 4,5 тысячы. Імплантавана 1268 электракардыястымулятараў, выканана 3660 каранараграфій, 662 стэнціраванні сасудаў. На сёння кардыяхірургічныя аперацыі праводзяцца ва ўсіх абласцях, за выключэннем Мінскай. Але і Мінскі на павінна падключыцца да гэтай справы ў пачатку наступнага года — неабходнае абсталяванне ў сталічным рэгіёне ўжо закупленае.

Па словах Васіля Жарко, колькасць аперацый па эндапратэзаванні тазасцегнавых суставаў павялічылася сёлета да 2,5 тысячы, а налета павінна ўзрасці да 4,5 тысячы. Да таго ж было зроблена 390 аперацый па эндапратэзаванні каленнага сустава. Сёння аперацыі па эндапратэзаванні суставаў ажыццяўляюцца ў Мінску, Брэсце і Магілёве, але плануецца ахапіць таксама і іншыя абласныя цэнтры.

Бясспрэчным прарывам можна лічыць засваенне беларускімі хірургамі аперацый па перасадцы печані: усяго зроблена сёлета 9 трансплантацый. Да таго ж за мінулы адрэзак года выканана 70 трансплантацый ныркі. Для параўнання, за папярэдні год было зроблена 40 трансплантацый нырак, а ў 2006 годзе — 20. Наступны крок, да якога рыхтуецца беларуская медыцына, перасадка сэрца. Тэхнічна наша краіна ўжо гатова да гэтай найскладанейшай аперацыі, і беларускія кардыяхірургі прайшлі стажыроўку ў краінах Балтыі, Германіі, Фінляндыі і Чэхіі. «Пры наяўнасці донара і рэцыпіента — аперацыю правядзём ужо ў наступным годзе, — запэўніў Васіль Жарко. — Да таго ж сёння мы нацэленыя таксама на перасадку кішэчніка, комплексу лёгкае-сэрца і падстраўнікавай залозы і нырак адначасова...»

Закранаючы тэму абслугоўвання пацыентаў у арганізацыях амбулаторна-паліклінічнага звяна, Васіль Жарко паведаміў, што з гэтага года ў беларускіх паліклініках у штатным раскладзе з'явілася пасада памочніка ўрача, які ўзяў на сябе частку абавязкаў доктара. Сёлета не было выпуску фельчараў з сярэдніх спецыяльных медыцынскіх навучальных устаноў, але налета сітуацыя зменіцца, што зменшыць кадравы дэфіцыт у першасным звяне медыцыны. Рэгістратуры паліклінік аснашчаюцца апаратамі шматканальнай сувязі, на пасады старшых медрэгістратараў прымаюцца толькі людзі з сярэдняй медыцынскай адукацыяй, удасканальваецца парадак выдачы талонаў, была рэгламентавана работа даўрачэбнага кабінета і аддзяленняў прафілактыкі, скарацілася колькасць выдаваемых даведак. Разам з тым, цяпер разглядаецца магчымасць пашырэння пераліку платных медыцынскіх паслуг, якія аказваюцца ў дзяржаўных установах аховы здароўя без ушчамлення інтарэсаў пацыентаў. «Усе сацыяльныя стандарты ў ахове здароўя абавязкова будуць выконвацца», — заспакоіў міністр.

Застаецца толькі дачакацца новых звестак сацыялагічных даследаванняў. Магчыма, здароўе, нарэшце, зойме ў беларусаў верхнія прыступкі ў рэйтынгу жыццёвых прыярытэтаў...

Надзея НІКАЛАЕВА.

Прысмакі ад афіцэраў КДБ

Напярэдадні Новага года чэкісты наведалі падшэфных дзяцей.

Сваю ўвагу, а таксама падарункі, камп'ютары і падборкі спецыяльных дыдактычных матэрыялаў прывезлі сваім падшэфным супрацоў-

Фота Артура СТРЭХА.

нікі падраздзялення цэнтральнага апарату Камітэта дзяржаўнай бяспекі і ўпраўлення ваеннай контрразведкі на чале з намеснікам старшыні КДБ генерал-маёрам Мікалаем Смаленскім. Больш за дзесяць гадоў КДБ аказвае дапамогу Мінскаму гарадскому цэнтру медыцынскай рэабілітацыі дзяцей з псіханеўралагічнымі захворваннямі.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Адкуль столькі ртуці?


Фота Артура СТРЭХА.

Шэсць тысяч долараў разлічвалі выручыць ад продажу 19,5 кг ртуці двое жыхароў г.п. Свір Мядзельскага раёна Мінскай вобласці.

Яны захоўвалі і разлівалі ртуць у пластыкавыя бутэлькі непасрэдна ў доме аднаго з іх. Як паведамілі ў цэнтры інфармацыі і грамадскіх сувязяў Камітэта дзяржаўнай бяспекі, падчас здзяйснення здзелкі прадаўцы і былі затрыманы аператыўнай групай КДБ. Парушальнікі закона нават не ведалі аб элементарных правілах асабістай бяспекі, аб тым, што могуць нанесці непапраўную шкоду свайму здароўю, здароўю навакольных і экалогіі ў цэлым. Следчым упраўленнем КДБ Беларусі ў дачыненні да іх узбуджана крымінальная справа па ч. 2 арт. 333 Крымінальнага кодэкса («Незаконны абарот моцнадзейных і атрутных рэчываў»). Затрыманыя размешчаны ў следчы ізалятар.

Святлана БАРЫСЕНКА.

2008-ы. Наўздагон

«КАЛІ Б НЕ... МОВА»?

Мой бацька некалі пачынаў працаваць на пошце і заўсёды выпісваў «Звязду». Так што я, калі выйшла замуж, доўга не думала над тым, што выпісваць.

«Звязда», бацькава газета, прыходзіла ў нашу сям'ю 53 гады, пакуль жывы быў мой муж, яна ж прыходзіць ужо 8 гадоў без яго і яна будзе прыходзіць, пакуль я буду бачыць, бо газета цікавая, праўдзівая, бо тут можна знайсці адказы на ўсе пытанні і ведаць пра ўсё — пра палітыку, медыцыну, культуру... Да таго ж «Звязду» проста прыемна ўзяць у рукі, яна заўсёды прыгожая, яна — свойская.

Але, як ні сумна гэта прызнаць, у нашай вёсцы, дзе жыве, мо, паўтары тысячы чалавек, выпісваем яе толькі я ды бібліятэка. Бывае, пачну агітаваць, раказаваць людзям пра ўсё цікавае, — слухаюць, згаджаюцца і, кажуць, што таксама чыталі б, выпісвалі б, калі б не... мова.

Я разумею іх. Школа ў нас рускамоўная недзе з 60-х. І яна стала такой па просьбе бацькоў. У выніку іх дзеці і ўсе наступныя пакаленні дзяцей мала вучылі беларускую мову, не паспявалі яе палюбіць. Можа я памыляюся, але мне здаецца, што яны ў многім абкрадзеныя, бо маглі ж ведаць дзве, а то і тры мовы, а ў выніку — не ведаюць роднай...

Я да вайны хадзіла ў беларускую школу, усё жыццё працавала ў вёсцы, фельчарам, выгадавала чацвёра дзяцей, размаўляю па-руску (прыходзіцца), але ж мову я вельмі люблю! Я хоць чытаю па-свойму!

Шчыры дзякуй газеце, усім журналістам, за гэту магчымасць, за радасць, якую вы прыносіце сваім чытачам. Поспехаў вам у вашай нялёгкай працы і новых падпісчыкаў.

Ніна Дзянісаўна ГАПАНЕНКА, *в. Броннае, Рэчыцкі раён.*

Ва Ўрадзе

ПАДТРЫМКУ Ў БЕЛАРУСІ АТРЫМАЮЦЬ ТОЛЬКІ ЭКСПАРТААРЫЕНТАВАНЫЯ І КАНКУРЭНТАЗДОЛЬНЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ

Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, дзе абмяркоўваліся меры па забеспячэнні стабільнай работы валаўтваральных і іншых прадпрыемстваў краіны, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Ён выказаў меркаванне, што існуючая сітуацыя прадоўжыцца «працяглы час», таму што стабілізацыі на знешнім рынку пакуль не назіраецца. Пры гэтым неабходна прыняць усе магчымыя меры, каб тавараабарот і беларускі экспарт не зніжаліся, асабліва ў гандлі з тымі краінамі, на рынках якіх Беларусь добра замацавалася. Практычна кожнае прадпрыемства ў рэспубліцы распрацавала сістэму антыкрызісных мераў. Цяпер неабходна забяспечыць яе рэалізацыю, каб атрымаць чаканы эфект, падкрэсліў Сяргей Сідорскі. Неплацяжы беларускім прадпрыемствам ад партнёраў з іншых краін, якія закрануў сусветны фінансавы крызіс, павялічыліся на 60 працэнтаў.

З прыняццем мераў па лібералізацыі ў прадпрыемстваў цяпер з'яўляецца больш свабоды дзеянняў. Галоўная задача сёння — гэта стварыць прадукт, прадаць яго і атрымаць выручку. На гэта павінны быць нацэлены ўсе працоўныя калектывы краіны, адзначыў прэм'ер-міністр.

Абзац

■ У Мінскай вобласці з 19 па 23 снежня ў выніку абледзянення ліній электраперадач адбыліся масавыя адключэнні электрычнасці. Таўшчыня сценкі галалёду на правадах дасягала 50 мм, на абсталяванні і апорах — да 100 мм. Акрамя таго, з-за падзення дрэваў на паветраныя лініі электраперадач адбыліся шматлікія абрывы правадоў, разбурэнне апор і кароткія замыканні ў электрасетках. Найбольш пацярпелі ад стыхіі Мінскі, Дзяржынскі, Капыльскі, Слуцкі і Стаўбцоўскі раёны. Было парушана электразабеспячэнне 451 населенага пункта, 23 жывёлагадоўчых фермаў і іншых сельскагаспадарчых спажыўцоў. На ўхіленні наступстваў працавалі больш за 700 чалавек. Па ацэнках спецыялістаў, апошні раз такі ўрон народнай гаспадарцы Міншчыны стыхія наносіла 30 гадоў таму.

■ **Снег, што выпаў у Гомельскай вобласці, абясточыў 15 населеных пунктаў — лініі электраперадач абарваліся пад цяжарам снегу. Парушэнне электразабеспячэння зафіксаванае ў Нараўлянскім, Ельскім і Калінкавіцкім раёнах.**

■ Барсетачнікаў, якія ажыццяўлялі крадзяжы на трасе «Мінск-Віцебск», затрымалі супрацоўнікі УУС Віцебскага аблвыканкама і докшыцкага РАУС. Група складалася з раней судзімых грамадзянаў Грузіі, якія мелі пасведчанні на права жыхарства ў Беларусі. Згодна з папярэдняй інфармацыяй, удзельнікі групы ажыццявілі больш за 10 крадзяжоў з аўтамабіляў. Яны на АЗС ці каля прыдарожных кавярняў прабівалі колы аўтамабіляў, потым суправаджалі сваю ахвяру. Калі пацярпелыя выходзілі з машыны, каб памяняць кола, зламыснікі краліі з салона грошы і маёмасць.

■ **На курскай пошце праходзіць конкурс — «Лепшае віншаванне паштоваму Дзеду Марозу». Самымі папулярнымі падарункамі, якія просяць дзеці, застаюцца, як летась, лялькі і радыёкіруемыя машынкі. Але шмат і новага — дзеці просяць у Дзеда «чароўную палачку, якая магла б рабіць грошы», а таксама сасіскі, мандарыны і піражкі з павідлам.**

■ Шасцёра расіянаў загінулі і 17 атрымалі раненні ў аўтааварыі ў Егіпце на поўдні Сінайскага паўвострава. Аўтобус, што перавозіў расійскіх турыстаў, перавярнуўся ўвечары 22 студзеня. Расіяне вярталіся з экскурсіі ў Іерусалім. Прычынай аварыі маглі стаць дрэнныя метэаўмовы.

■ **Адключэнне электрычнасці стала прычынай спынення самага вялікага кола агляду ў свеце — сінгапурскага «Флаера». Інцыдэнт адбыўся ўчора ўвечары, у момант спынення на коле знаходзіліся больш за 100 чалавек. Гэта ўжо трэцяя аварыя з моманту запуску кола сёлета ў лютым. Яго вышыня складае 165 м.**

■ Удыханне дыму ад фееркверкаў, асабліва зялёных, можа справакаваць прыступы астмы і прывесці да абвастрэння захворванняў дыхальных шляхоў. Да такіх высноў прыйшлі аўстрыйскія навукоўцы пасля даследавання прадуктаў згарання рэчываў, што ўтрымліваюцца ў піратэхніцы. У адной з вёсак пасля заканчэння святочнага шоу з выкарыстаннем піратэхнікі яны выявілі ў снежным покрыве значную колькасць барыю — рэчыва, што надае фееркверкам зялёны колер. Канцэнтрацыя барыю павялічылася ва ўзорах снегу ў 500 разоў. Між тым удыханне гэтага рэчыва вельмі негатыўна ўплывае на работу органаў дыхання.

Поўны абзац

■ Нямецкі фізік з Тэхнічнага ўніверсітэта ў Ніжняй Саксоніі вылічыў хуткасць палёту корка ад шампанскага. З дапамогай фотаэлектрычных і акустычных прыстасаванняў вучоны ўстанавіў, што хуткасць корка дасягае 40 км/гадз. Тэарэтычна хуткасць корка можа дасягаць і 100 км/гадз, але для гэтага трэба, каб бутэлька паляжала на сонцы, пад прамымі промнямі, а пасля была добра ўзбаўтаная. Што ж датычыцца корка з бутэлькі, якую дасталі з лядоўні і не ўзбаўталі, то хуткасць у такім выпадку будзе невялікай і для людзей бяспечнай.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ТАКОЕ КІНО...

Кінамеханік аднаго з сельскіх дамоў культуры Лоеўскага раёна такім макарам «удасканаліў» метады сваёй працы, што атрымаў за тры гады прымененых хітрыкаў 2427 тысяч рублёў. Грошы былі незаконныя, можна сказаць, знятыя з паветра таго СДК. Якім чынам? «Рацыяналізатар» складаў фіктыўныя справаздачы аб правядзенні кінасеансаў, якія і не думаў праводзіць. А цяпер у яго — непрыемнасці.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

**«Минский город

АДКРЫТАЕ АКЦЫЯНЕРНАЕ ТАВАРЫСТВА «БРЭСТГАЗААПАРАТ»:

ШМАТГАДОВЫЯ ТРАДЫЦЫІ ЯКАСЦІ, ЗРУЧНАСЦІ, КАМФОРТУ, ПРАВЕРАНЫЯ ЧАСАМ

ЛІДАРУ АЙЧЫННАГА РЫНКУ ПА ВЫТВОРЧАСЦІ «БЕЛАЙ ТЭХНІКІ» — 58 ГАДОЎ

Сёлета споўнілася роўна паўстагоддзя, як з канвеера Брэсцкага механічнага завода, цяпер ААТ «Брэстгазаапарат», сышла першая 4-канфорачная газавая пліта. Адбылася гэта падзея 7 лістапада 1958 года.

Начальнік аддзела маркетынгу Ала ШАЛЮТА мае ў сваім кабінеце вялікую карту, дзе пазначаны ўсе краіны, якія купляюць брэсцкія плиты.

***Сумеснае прадпрыемства ААТ «Брэстгазаапарат»** — адзін з найбуйнейшых вытворцаў газавых, электрычных і камбінаваных газаэлектрычных плітаў на тэрыторыі СНД, які вось ўжо на працягу 58 гадоў дыктуе моду на рынку «белай тэхнікі» як Беларусі, так і многіх краін былога Саюза. За больш чым паўвекавую гісторыю дзейнасці ў свядомасці шматлікіх пакупнікоў (а якасць брэсцкіх пліт, цяпер з гандлёвай маркай «Гефест», ведаюць больш за 20 мільёнаў адрасатаў) сфарміраваўся станоўчы імідж прадукцыі прадпрыемства ў вачах сваіх пакупнікоў. Прыемна, што яны, характарызуючы паказчыкі якасці, камфортнасці, зручнасці, знешняй прывабнасці пліт «Гефест», скажуць: «фірма гарантуе». І гэта — найвышэйшая адзнака народнага прызнання.*

Геаграфія паставак тавару, які ўжо дзясятак гадоў пазіцыянуецца на розных рынках збыту з маркай «Гефест», надзвычай шырокая. Яшчэ нядаўна — гэта бяскрайняя прастора Савецкага Саюза, цяпер — краіны СНД і Прыбалтыкі. У асяроддзі дылераў і супрацоўнікаў рэкламна-маркетынгавай службы СП «Брэстгазапарат» можна пачуць, што брэсцкія пліты добра вядомыя хатнім гаспадыням ад Таліна да Чукоткі. У іншай «транскрыпцыі» — «Гефест» знаходзіцца ў ліку лепшых сярод аналагічных прадпрыемстваў не толькі ў Расіі, але і ў іншых краінах, аб чым сведчыць наяўнасць еўрапейскага сертыфіката YDE на электрычныя пліты і польскага — на газавыя. Акрамя таго, прадукцыя прадпрыемства сертыфікавана па міжнароднай сістэме стандартаў ISO-9001 і ISO-2000, што ў сваю чаргу таксама з'яўляецца пацвярджэннем яе высокай якасці.

У большай ступені яна дасягаецца майстэрствам кіраўніцтва прадпрыемства, асабліва інжынерна-тэхнічнай і рэкламна-маркетынгавай службы, якія ўважліва адследжваюць модныя павевы на рынку «белай тэхнікі» праз шырокую дылерскую сетку і фірмовыя магазіны «Гефест». Не дзіўна, што пліты з гандлёвай маркай «Гефест» паспяхова канкуруюць больш чым з дзвюма дзясяткамі фірмаў, прадукцыя якіх у Беларусі і Расіі прадстаўлена такімі сусветнавядомымі брэндамі, як «Elektrolux, Ariston», «Indesit», «Siemens», Gorenje, Zanussi і іншымі. Брэсцкія пліты па сваіх тэхнічных характарыстыках істотна пераўзыходзяць аналагічныя вырабы заводаў СНД, а па экалагічных параметрах не саступаюць вырабам аналагічнага класа заходняй вытворчасці.

Адпаведнасць самым апошнім модным навінкам, якія традыцыйна заўсёды супадаюць з патрабаваннямі часу, у многім забяспечваецца чалавечым фактарам пры ўмове пастаяннага ўстойлівага фінансавага становішча і дасягнення гібкасці вытворчасці, якая дазваляе аператыўна і адэкватна рэагаваць на змяненні патрабаванняў рынку, Менавіта на гэтых «умовах» сфарміравана ўласная інвестыцыйная стратэгія. Немалаважна, што СП ААТ «Брэстгазаапарат» здзяйсняе сваю інвестыцыйную дзейнасць за кошт уласных сродкаў.

За апошні час прадпрыемства асвоіла выпуск практычна ўсяго шэрагу стацыянарных газавых, электрычных і камбінаваных пліт асноўных тыпапамераў і «малой» тэхнікі — настольных пліт з духоўкамі і ўбудаваных газавых сталоў і духовак.

Сёння завод выпускае звыш 80 мадыфікацый разнастайных вырабаў. Толькі за адну змену з канвеера сыходзіць каля 1250 напольных пліт на галаўным прадпрыемстве і каля 500 — на даччыным прадпрыемстве «Гефест-тэхніка», а таксама 240 паветраачышчальнікаў, 500 настольных пліт, звыш 80 адзінак убудоўваемай тэхнікі.

Дзякуючы таму што завод ужо завяршыў праграму тэхнічнага пераўзбраення дзейнай вытворчасці, частка ўласнага прыбытку планава была затрачана на інвестыцыі ў рамках дыверсіфікацыі вытворчасці, гэта значыць ў асваенне прынцыпова новых для завода вырабаў.

СП ААТ Брэстгазаапарат» — гэта:

- стацыянарныя газавыя пліты;
- стацыянарныя электрычныя пліты;
- стацыянарныя камбінаваныя газаэлектрычныя пліты;
- убудоўваемая тэхніка (вараныя панэлі, духавыя шафы);
- настольныя пліты (2 і 4-канфорачная таганкі, 1-канфорачная турыстычныя);
- паветраачышчальнікі

Усе гэтыя здымкі справядліва аб'ядноўвае фота маленькай газавай пліты, якая выпушчана на прадпрыемстве 50 гадоў таму і займае сёння сваё пачэснае месца ў экспазіцыі заводскага музея. Побач з ёй сучасная газаэлектрычная пліта з газавымі гарэлкамі і электрадухоўкай выглядае цудам тэхнікі (на здымках яны побач). Кантралёр Марына ДУБРАВА паказала нам гэтую навінку і ўдакладніла, што апошнія мадэль пачала сыходзіць з канвеера ўсяго месяц таму. Хуткае абнаўленне мадэльнага раду дасягаецца ў тым ліку дзякуючы сучаснаму высокапрадукцыйнаму абсталяванню. Такому, напрыклад, як лістапрабіўны прэс «REINER» (на верхнім здымку). Дарэчы, знешні выгляд вытворчага будынка таксама гаворыць аб тым, што тут дзейнічае сучаснае прадпрыемства.

Рэклама — рухавік прагрэсу. Маркетынг — яго поспех

Гіганцкія крокі ў рэалізацыі пліт з маркай «Гефест» за апошняе дзесяцігоддзе ў некаторых сёння могуць пасяць ілюзію бязвоблачнага дабрабыту на СП ААТ «Брэстгазаапарат». Маўляў, вытворчасць і рэалізацыя ўсёй прадукцыі ідзе як па масле і на блізкую перспектыву завод забяспечаны. Але гэта не так. Для таго каб дылеры, якіх больш за паўсотню, з ахвотай бралі брэсцкія пліты і яны з ходу знаходзілі сваіх пакупнікоў, тут пастаянна працуюць не толькі над знешнімі характарыстыкамі і ўнутранай «начынкай» кожнай пліты, убудоўваемай духоўкі ці стала, але і правільна вядуць рэкламна-маркетынгавую палітыку. Гэта значыць, пастаянна нагадваюць пра сябе ў сродках масавай інфармацыі, праводзяць адпаведную работу ў асяроддзі сваіх дылераў, «свецяцца» на рэкламных вулічных бігбордах і на плакатах у буйных гандлёвых пунктах, цесна працуюць на прынцыпах адваротнай сувязі праз фірмовыя магазіны прадпрыемства.

У многім дзякуючы прафесійнаму маркетынгу паспяхова вырашаецца задача па забеспячэнні прадукцыі з маркай «Гефест» шырокай геаграфіі паставак. На сёння 75 працэнтаў вырабленай прадукцыі ідзе на экспарт у Расію. Акрамя таго, пастаянныя клиенты ААТ «Брэстгазаапарат» — Украіна, Малдова, Азербайджан, Казахстан, Узбекістан, Кыргызстан, Грузія, Прыбалтыйскія краіны. У неабходных аб'ёмах забяспечваюцца беларускія спажыўцы, невялікія пастаўкі электраплітаў рабіліся ў Германіі

« Марка «Gefest» — гэта гарантыя экалагічнай бяспекі прадукцыі і вытворчасці

Сёлета СП ААТ «Брэстгазаапарат» правяло маштабную кампанію пад дэвізам «GEFEST» — ідэальная выпечка! Рэкамендавана «Растэст», якая ахоплівае практычна ўсе рэгіёны Расіі. Яркія, захапляльныя тэлевізійныя ролікі з выкарыстаннем вобраза Калабка і рэкламныя заставкі ў праграме «Фазэнда» на Першым расійскім канале ўбачылі практычна ва ўсіх гарадах Расіі. Зрэшты, яна з'яўляецца асноўным рынкам збыту прадукцыі з маркай «Гефест». Праўда, нягледзячы на гэта, вялікая ўвага надаецца і камунікацыйнай палітыцы ў Рэспубліцы Беларусь.

Гэта было нядаўна...

За паўвекавую гісторыю на прадпрыемстве адбылося шмат падзей, з якіх некаторыя мелі знакавае значэнне.

1958 год — выпушчана пешая газавая пліта;

1959 год — завод перайменаваны ў Брэсцкі завод газавай апаратуры;

1960 год — на прадпрыемстве праведзена першая рэканструкцыя;

1968 год — сабрана мільённая газавая пліта;

1976—1980 гг. — праведзена істотная рэканструкцыя і тэхнічнае пераўзбраенне завода;

1994 год — адбываецца акцыянаванне завода і перайменаванне ў ААТ «Брэстгазаапарат»;

2008 год — канвеер прадпрыемства ўжо налічвае паўвекавую гісторыю...

Калектыў СП ААТ «Брэстгазаапарат» віншуе з надыходзячымі Калядамі і Новым 2009 годам сваіх сяброў, партнёраў, пакупнікоў і жадае ўсім моцнага здароўя,жыццёвага аптымізму і новых творчых поспехаў!

Фірменны магазін GEFEST у Брэсце ведаюць не толькі жыхары абласнога цэнтра. Сюды прыязджаюць зблізку і здалёк, каб атрымаць кампетэнтную кансультацыю, пазнаёміцца з шырокім асартыментам і зрабіць трапную пакупку. Прадаўцы высокага разраду Зоя КАРАЛЬКО і Ірына КЛІМАХОВІЧ (іх фотааб'ектыў зазняў у залах крамы) дадалі, што да таго ж пакупкі тут значна таннейшыя, чым у іншых гандлёвых установах.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29.04.2008 г. № 239 па выніках работы за 2007 г. прадпрыемства УП «Гефест-тэхніка» занесена на Рэспубліканскую дошку гонару.

СП ААТ «Брэстгазаапарат» запрашае да супрацоўніцтва зацікаўленыя бакі!

НАШЫ РЭКВІЗІТЫ:

Рэспубліка Беларусь,
224016, г. Брэст.
вул. Арджанікідзэ, 22
Аддзел маркетынгу:
тэл.: (+375 162) 21 70 52,
23 74 82
тэл/факс: 21 19 11
Internet:www.gefest.com
E-mail main@gefest.com

УНП 200050520.

Кожная базавая мадэль пліты «Гефест» мае мноства выканняў, розных па колеры, дызайне і функцыянальнай аснашчанасці. А гэта азначае, што ў вас ёсць свабода выбару. Любыя вашы жаданні «Гефест» выканае ў сваёй кухоннай тэхніцы.

Купляючы пліту «Гефест», вы насамрэч набываеце новае разуменне таго, што нават за паўсядзённымі клопатамі хаваецца задавальненне.

Сучасныя кухонныя пліты, упэўнены вытворцы тэхнікі «Гефест», пазбавяць вас ад такіх праблем, дапамогуць раскрыць вашы кухарскія здольнасці, прыгатаваць смачныя стравы, зэканоміць пры гэтым сілы і час.

Бо добрая пліта — гэта крыніца добрага настрою, надзейная кухарка, якая стане гарантам адмысловага густу гаспадыні.

Матэрыялы падрыхтавалі Уладзімір ЗДАНОВІЧ, Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

А нядаўна ў Маскве ў рамках V форуму дзелавога супрацоўніцтва горада Масквы і Рэспублікі Беларусь, які прайшоў у расійскай сталіцы, мэр Масквы Юрый Лужкоў уручыў кіраўніку УП «Гефест-тэхніка» Ганаровы дыплом. А гэта яскрава сведчыць, што беларускае прадпрыемства мае трывалыя пазіцыі на расійскім рынку.

На канвееры зборкі можна ўвачавідкі бачыць, у якія прыгожыя і высокатэхналагічныя вырабы ўвасабляецца праца рабочых і спецыялістаў. Сярод завадчан шмат моладзі — а гэта азначае, што ў прадпрыемства добрыя перспектывы, бо лепшыя кадры заўжды вырастаюць унутры самога калектыву. У Таццяны ІСАЕВАЙ працоўная біяграфія яшчэ толькі пачынаецца (яна працуе маляром і адказвае за прыгожую афарбоўку пліт і ачышчальнікаў паветра). Сяргей МАРТЫНЮК — кваліфікаваны аператар вышэйшага разраду, яму даручаны магутны пяціпазіцыйны прэс, які развівае ціск да 630 тон.

ААТ «Брэстгазаапарат»: рост аб'ёмаў — на новых вытворчых плошчах «Гефест-тэхнікі».

З'яўленне новых вытворчасцяў — УП «Гефест-Кварц», УП «Гефест-тэхніка» — гэта яшчэ адно вялікае дасягненне ААТ «Брэстгазаапарат» у плане рэалізацыі палітыкі па рэальным пашырэнні і дыверсіфікацыі вытворчасці. Спачатку, у 2000 годзе, нарадзілася прадпрыемства «Гефест-Кварц», на якім наладжаны выпуск загартаванага дэкаратыўнага шкла для газавых і электрычных пліт, якое раней набывалася па імпарце. Зразумела, што ад гэтага сабекошт кожнай вырабленай пліты стаў значна меншым, чаго і дабіваецца ўвесь час кіраўніцтва прадпрыемства.

Стратэгічная задача любога прадпрыемства, якое ставіць для сябе грандыёзныя планы і мае амбіцыі лідара, — рост вытворчых паказчыкаў за кошт павелічэння аб'ёма выпуску якаснай і запатрабаванай на рынку прадукцыі. На ААТ «Брэстгазаапарат» гэта зразумелі даўно. Таму яшчэ ў 2003 годзе было створана даччынае прадпрыемства «Гефест-тэхніка». Яно вырасла ў Свабоднай эканамічнай зоне «Брэст» на тэрыторыі ў 22 тысячы квадратных метраў, выкупленай у Брэсцкага машынабудаўнічага завода. На новым прадпрыемстве быў паспяхова арганізаваны выпуск электрычных і газаэлектрычных пліт і сучасных паветраачышчальнікаў розных тыпаў.

За кароткі тэрмін, меней чым за год, на новай тэрыторыі была праведзена рэканструкцыя вытворчага корпуса і прылеглай тэрыторыі, арганізаваны і наладжаны выпуск прадукцыі.

Ужо ў пачатку 2005 года тут пачаўся серыйны выпуск і рэалізацыя прадукцыі.

Пліты, што выпускае УП «Гефест-тэхніка», маюць сучасны дызайн, высокую якасць за кошт прымянення найноўшых тэхналогій, канструктыўных рашэнняў, новых матэрыялаў і паспяхова канкуруюць з аналагічнага класа прадукцыяй вядучых замежных вытворцаў. Як паказчык прызнання якасці — у апошні час пліты газаэлектрычныя, электрычныя, паветраачышчальнікі і выцяжкі кухонныя, а таксама газавыя бытавыя і газавыя настольныя прызнаваліся лаўрэатамі конкурсаў «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь» і «Лепшыя тавары на рынку Расійскай Федэрацыі» з правам маркіроўкі прадукцыі лагатыпамі конкурсаў на працягу трох гадоў.

Кіраўніцтва холдынга далейшае пашырэнне наменклатуры выпускаемай прадукцыі сёння звязвае выключна з нарошчваннем вытворчых магутнасцяў на даччыным прадпрыемстве «Гефест-тэхніка». Для гэтага ў канцы мінулага года на ААТ «Брэстмаш» былі набыты 11 тысяч квадратных метраў вытворчых плошчаў, на якіх адразу пачаліся рэканструкцыя і аснашчэнне сучасным абсталяваннем.

Ноу-хау — у дзеянні

Якасць прадукцыі і эфектыўнасць вытворчых працэсаў дасягаецца на прадпрыемстве за кошт укаранення ў вытворчасць прагрэсіўных тэхналагічных працэсаў і абсталявання. Як і на галаўным прадпрыемстве, на УП «Гефест-тэхніка» пастаянна вядзецца тэхнічнае пераўзбраенне вытворчасці, пашырэнне і абнаўленне парка тэхналагічнага абсталявання, у тым ліку набыццё імпартнага высокапрадукцыйнага і высокадакладнага абсталявання. Усё гэта накіравана на стварэнне збалансаванага гібкага вытворчага комплексу з магчымасцю далейшага павелічэння вытворчых магутнасцяў завода і павышэння якасці прадукцыі.

Укараненне сучасных тэхналогій накіравана на забеспячэнне канкурэнтназдольнай якасці прадукцыі з выкарыстаннем новых прагрэсіўных матэрыялаў з мэтай зніжэння матэрыяльных затрат і энергетычных рэсурсаў у вытворчасці і росту прадукцыйнасці працы.

Новае абсталяванне

У пачатку чэрвеня 2008 года на УП «Гефест-тэхніка» пачаліся работы па падрыхтоўцы і ўстаноўцы пяціпазіцыйнага прэса «AIDA» намаганнем 630 тон італьянскай вытворчасці. Перавага новага прэса — павелічэнне колькасці адначасова аперацый, што праводзяцца, і атрыманне гатовых дэталяў, якія не патрабуюць дапрацоўкі, што прыводзіць да зніжэння каэфіцыента загрузкі абсталявання і вырабу дэталяў павышанай складанасці ў аўтаматычным рэжыме. Гэта істотны плюс, паколькі пасля вырабу дэталяў на дзейным чатырохпазіцыйным прэсе «Manzoni» намаганнем 630 тон для атрымання гатовых дэталяў даводзілася выкарыстоўваць дадатковае абсталяванне і ручную працу.

Прэс «AIDA» прыняты ў эксплуатацыю сёлета ў пачатку кастрычніка.

Асваенне вытворчасці новых вырабаў

Інвестыцыйная стратэгія УП «Гефест-тэхніка» ставіць сваёй мэтай планамернае нарошчванне свайго тэхніка-эканамічнага патэнцыялу для забеспячэння ў перспектыве эфектыўнай вытворчасці, стварэнне, выпуск і рэалізацыю высокаканкурэнтнай прадукцыі.

Праца службаў завода накіравана на ўкараненне новай прадукцыі, павышэнне яе якасці, канкурэнтаздольнасці ў адпаведнасці з патрабаваннямі спажывецкага рынку.

У 2008 годзе на УП «Гефест-тэхніка» праведзена мадэрнізацыя канструкцыі серыйна выпускаемых вырабаў, якія значна паляпшаюць знешні выгляд і эксплуатацыйныя характарыстыкі вырабаў.

УП «Гефест-тэхніка» спецыялізуецца на вытворчасці бытавых газавых, электрычных і газаэлектрычных пліт, паветраачышчальнікаў і выцяжак кухонных разнастайных мадэляў і мадыфікацый гандлёвай маркі «GEFEST».

— Выява румянага духмянага Калабка заняла сваё месца на рэкламе завода і ўвасабляе высокую якасць выпечкі, гарантаваную брэсцкімі плітамі, — сказала нам інжынер па тэхінфармацыі Тамара ГУЦІК. У цэхах прадпрыемства мы сфатаграфавалі некалькі відаў сучаснага абсталявання, якое забяспечвае такую высокую гарантыю. Гэта суперпрэс «AIDA» (на здымку злева) і зварачны комплекс «KUKA», які вядзе дакладную зварку ў аўтаматычным рэжыме.

ПЕНСІІ ЗА ВЫСЛУГУ ГАДОЎ НЕ ЗНІКНУЦЬ

На пытанні чытачоў «Звязды» адказваюць намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валерый Валер'евіч КАВАЛЬКОЎ і намеснік начальніка аддзела развіцця пенсійнай сістэмы Сафія Рыгораўна СВЯРДЛОВА.

(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 17, 18, 20 і 23 снежня.)

☎ — Чаму індывідуальны каэфіцыент не карэктуецца з улікам інфляцыі?

Іван Андрэевіч ШЫШКІН, *г. Жлобін*

— Індывідуальны каэфіцыент заробку — гэта паказчык суадносінаў асабістага заробку пенсіянера і сярэдняга заробку працаўніковай па краіне за пэўны перыяд. Прычым пры памнажэнні індывідуальнага каэфіцыента заробку на сярэднюю зарплату працаўнікоў, што выкарыстоўваецца для вылічэння пенсіі ў цяперашні час, адбываецца «асучасненне» мінулага заробку. Інакш кажучы, мінулы заробак індэксуецца да сучаснага ўзроўню.

☎ — Калі малодшаму з 5 дзяцей споўнілася 16 гадоў, хацела аформіць пенсію. Але мне адмовілі. Ці маю я права на льготную пенсію з улікам таго, што я працавала з 1983 года?

Ніна Васільеўна КУЧКО, *Клецкі раён*

— Незалежна ад узросту на датэрміновую пенсію могуць пайсці жанчыны, якія нарадзілі і выхавалі да 16-гадоў пяцёра і больш дзяцей, пры ўмове, што стаж работы такіх жанчын у калгасах саўгасах і іншых сельгаспрадпрыемствах непасрэдна ў вытворчасці сельгаспрадукцыі складае не менш за 10 гадоў. І прычым — без уліку часу догляду дзяцей.

Калі ж стаж работы непасрэдна ў вытворчасці сельгаспрадукцыі складае менш за 10 гадоў, то жанчына, якая нарадзіла і выхавала да 8-гадовага ўзросту пяць і больш дзяцей (а таксама жанчына, у якой пятаму дзіцяці яшчэ не споўнілася 8 гадоў), пры стажы 15 і больш гадоў можа выйсці на датэрміновую пенсію толькі ў 50 гадоў.

☎ — Сёлета пераехала на пастаяннае жыхарства з Расіі і аформіла ў Беларусі пенсію. Аднак пры гэтым, па-першае, не атрымала пенсію за студзень — сакавік. А па-другое, ёсць сумненні наконт яе цяперашняга памеру. Выплата ў Расіі складала каля 4500 расійскіх рублёў, выплата ж у Беларусі — 196 тысяч. Чаму?

Бажынка Міхайлаўна ГАЗЕТАВА, *г. Баранавічы*

— Як вядома, з 29 сакавіка 2007 года пытанні пенсійнага забеспячэння грамадзян Беларусі і Расіі, якія пераязджаюць з адной краіны ў другую, рэгулююцца двухбаковым дагаворам аб супрацоўніцтве ў галіне сацыяльнага забеспячэння ад 24 студзеня 2006 года. З улікам палажэнняў гэтага дагавора, па новым месцы жыхарства пенсіі прызначаюцца з першага дня месяца, які надыходзіць пасля месяца падачы заявы ў кампетэнтную арганізацыю. Пры гэтым за перыяд з даты спынення выплаты пенсіі і да даты прызначэння пенсіі па новым месцы жыхарства даплату робіць тая з дзяржаў, якая плаціла пенсію да пераезду.

Паводле інфармацыі ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Баранавіцкага гарвыканкама, аддзяленнем Пенсійнага фонду Расіі па Новасібірскай вобласці 9 снежня сума вашай пенсіі за студзень—сакавік 2008 года была накіравана ў Беларусь паштовым пераводам. Што ж да пытання наконт вылічэння пенсіі ў нашай краіне, то міністэрствам дадзена даручэнне ўпраўленню па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Баранавіцкага гарвыканкама праверыць дакладнасць прымянення ў адносінах да вас нормаў міждзяржаўнага дагавора, і ў тым ліку — вылічэння пенсіі. Аб выніках праверкі ўпраўленне праінфармуе вас дадаткова.

☎ — Мая жонка з'яўляецца інвалідам-чарнобыльцам III групы паводле 18 артыкула. Ці можа быць зроблены пераразлік пенсіі за кожныя 24 месяцы работы пасля яе прызначэння?

І другое. Ці зможа жонка ў 45 гадоў перайсці з пенсіі па інваліднасці на пенсію па ўзросце. І ці будзе сэнс у такім пераходзе?

Уладзімір Васільевіч, *Лунінецкі раён*

— Артыкул 69-1 Закона «Аб пенсійным забеспячэнні» вызначае: пенсіянеру, які атрымлівае пенсію па інваліднасці (незалежна ад яе прычыны) і адпрацаваў 24 месяцы з больш высокім заробкам, налічваецца новы індывідуальны каэфіцыент з гэтага больш высокага заробку — у дадзеным выпадку з адпаведнай заявай неабходна звярнуцца ва ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы жыхарства.

Прычым трэба мець на ўвазе, што заробак для пераразліку пенсій можа вызначацца толькі паводле агульных нормаў, у прыватнасці, сёлета за любыя 14 з апошніх 24 гадоў работы, у 2009 годзе — за любыя 15 з апошніх 25 гадоў і гэтак далей.

Што да датэрміновага выхаду на пенсію, то такое права прадугледжана артыкулам 47 Закона «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС». Так, асобам, што атрымалі прафесійнае захворванне, звязанае з прамянёвым уздзеяннем на работах па эксплуатацыі Чарнобыльскай АЭС або ў зоне эвакуацыі (адчужэння), а таксама асобам, якія сталі інвалідамі ў выніку наступстваў катастрофы, пенсіі па ўзросце прызначаюцца незалежна ад працягласці працы ў шкодных умовах: мужчынам — пасля дасягнення 50-гадовага ўзросту і пры стажы працы не меншым за 20 гадоў, жанчынам — пасля дасягнення 45-гадовага ўзросту і пры працоўным стажы не меншым за 15 гадоў. Прычым, Уладзімір Васільевіч, заўважым, што пытанне аб мэтазгоднасці пераходу з пенсіі па інваліднасці на пенсію па ўзросце таксама будзе разгляджана ўпраўленнем па працы, занятасці і сацыяльнай абароны па месцы атрымання пенсіі.

☎ — Патлумачце, як і на якіх умовах можа пайсці на пенсію за выслугу гадоў мужчына-настаўнік дапаможнай школы? У прыватнасці, у якім узросце можна выйсці на такую пенсію, колькі для гэтага трэба спецыяльнага стажу і за які час павінен быць гэты стаж?

Мікалай Аляксандравіч, *г. Шаркоўшчына*

— Паводле 48 артыкула Закона «Аб пенсійным забеспячэнні», права на пенсію за выслугу гадоў маюць асобныя катэгорыі педагагічных работнікаў: мужчыны пасля дасягнення 55-гадовага ўзросту і пры наяўнасці не менш чым 30 гадоў спецыяльнага стажу і жанчыны пасля дасягнення 50-гадовага ўзросту і пры наяўнасці не менш чым 25 гадоў спецыяльнага стажу.

Пры гэтым кола асобаў, якія маюць права на такую пенсію, вызначана Пералікам устаноў, арганізацый і пасад, зацверджаным пастановай Савета Міністраў ад 1 снежня 1992 года № 724. Настаўнікі дапаможных школ у гэты Пералік не ўвайшлі, адпаведна, права на пенсію за выслугу гадоў ім не даецца.

Сяргей ГРЫБ.

«У ФУТБОЛЕ ЗАЎСЁДЫ ЁСЦЬ ШАНЦ. У НАШЫМ ВЫПАДКУ — ШАНЦ АЎТСАЙДАРА»

Бернд ШТАНГЕ:

На пытанні нашых чытачоў, што датычыліся нацыянальнай зборнай, выступлення БАТЭ ў Лізе чэмпіёнаў, а таксама іншыя, якія вы маглі задаваць папярэдне па тэлефоне або праз інтэрнэт, адказаў галоўны трэнер каманды Бернд Штанге.

(Працяг. Пачатак у нумары за 23 снежня.)

АБ ЗБОРНАЙ:

— Зборная Беларусі пасля 3 матчаў адборачнага цыкла заняла тое месца, якое павінна была заняць?

Георгій Іванавіч, *Магілёў*

— Не. Нам трэба рэабілітавацца за паражэнне ад Украіны. Англічане надзвычай моцныя і працягнуць сваё трыумфальнае шэсце ў гэтым адборачным цыкле. Мы павінны змагацца за другое месца.

— Чаго не хапае зборнай, каб на роўных гуляць са зборнай Англіі і перамагаць?

berkut32, *Мінск*

— 60 хвілін мы гулялі на роўных, цалкам аддаваліся барацьбе. Але ў вырашальнай стадыі супернік быў лепш гатовым фізічна і больш упэўненым у сабе. З іх вопытам выступлення ў прэм'ер-лізе і шматразовага ўдзелу ў Лізе чэмпіёнаў англічане паказалі нам і іншым супернікам сваю перавагу.

— Што пасля прыезду ў беларускую зборную захацелася змяніць і ці ўдалося гэта?

Валерый Сцяпанавіч ЛЕБЕДЗЕЎ, *г. Лепель*

— Я прыхільнік хуткага камбінацыйнага футбола, арыентаванага на атаку. І толькі з гульцамі, якія лічаць за вялікі гонар быць запрошанымі ў зборную. Я ўпэўнены, што ў гэтым плане мы цалкам змяніліся, хоць мне давялося прымаць балючыя рашэнні.

— Які з матчаў нацыянальнай каманды за час вашай працы захацелася хутчэй забыць?

chitatel, *Віцебскі раён*

— Ніякі. Але мяне вельмі разславаў матч на Кіпры, таму што з такім стаўленнем мы ніколі нічога не дасягнем. Не магу прыняць адгаворку, маўляў, многіх не хапала, БАТЭ не адпусціў сваіх гульцоў. Без канцэнтрацыі і напалову ў адпачынку каманда ўвогуле не павінна была гуляць. Што ж, у гэтым плане тая катастрофа стала для нас урокам. Будзем рабіць высновы!

— За што можаце адлічыць гульца са зборнай і як увогуле ў камандзе з дысцыплінай? Ці ведаеце, напрыклад, хто з гульцоў курыць і як на гэта рэагуеце?

doctor, *Мінск*

— Зборная — гэта штосьці асаблівае, вялікае, узор для ўсіх. Адпаведна трэба сябе паводзіць і прымаць правілы каманды. Мы часта збіраемся толькі на 2-3 дні, і ў гэты час праблем з дысцыплінай быць не павінна. Нам патрэбна больш прафесіяналізму ў свядомасці гульцоў, гэта значыць, што мы павінны іх лепш выхоўваць. Тыя, хто курыць ці п'е, у спорце высокіх дасягненняў шанцаў не маюць, і гульцы гэта ведаюць. У таго, хто гэтага не разумее, у нашай камандзе няма месца.

Прамую лінію правяла Алена АЎЧЫННІКАВА.
(Працяг будзе.)

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Витебский областной центр маркетинга

Организатор аукциона: Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210025, г. Витебск, ул. «Правды», 32

ККУП «Витебский областной центр маркетинга» проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома

№ лота	Кадастровый номер, площадь и адрес земельного участка	Целевое назначение	Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений. Ограничения использования земель	Начальная цена земельного участка (бел. руб.)	Размер задатка и реквизиты для его внесения	Расходы по подготовке документации, необходимой для проведения аукциона, руб.	Расходы, связанные с проведением аукциона	Дата, время и место проведения аукциона	Окончательный срок приема документов
1.	Земельный участок с кадастровым номером 223686300601000244, площадью 0,2000 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Понизовский с/с, д. Бабиничи, ул. Заводская, 4	Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома	Наличие централизованного газоснабжения, водоснабжения, водоотведения, теплоснабжения. Участок находится в радиусе до 500 метров от центра населенного пункта, примыкает к асфальтированным дорогам и улицам. Ограничения: охранная зона системы газоснабжения	2 656 192	265 000 бел. руб. р/с 3641322000707 в отделении ОАО «Белагропромбанк», код 418, УНП 300074143, код платежа 04901, получатель платежа: Оршанский районный исполнительный комитет	609 479	1 389 580	**26.01.2009 г. в 15.00 г. Орша,** ул. Островского, 2 в здании Оршанского районного исполнительного комитета (малый зал)	20.01.2009 г. до 17.30
1.	Земельный участок с кадастровым номером 221287001101000368, площадью 0,1759 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Новкинский с/с, д. Бороники, У-12, ул. Пригородная, 7	Земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание жилого дома)	Инженерные коммуникации отсутствуют	1 116 086	111 000 бел. руб. р/с 3600314100017 в ф-ле № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 259, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: Новкинский сельский исполнительный комитет	573 458	1 870 627	**27.01.2009 г. в 15.00** г. Витебск, ул. «Правды», 32, ККУП «Витебский областной центр маркетинга»	21.01.2009 г. до 17.30
2.	Земельный участок с кадастровым номером 221283703101000057, площадью 0,2401 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Куринский с/с, д. Задвинье, ул. Надречная, 3А	Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома	Наличие централизованного водоснабжения, участок находится в радиусе до 500 метров от центра населенного пункта. Ограничения: водоохранная зона водного объекта вне прибрежной полосы (река Западная Двина)	364 283	36 000 бел. руб. р/с 3600314070017 в ф-ле № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 259, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель Куринский сельский исполнительный комитет	550 092	2 256 455		21.01.2009 г. до 17.30
	ККУП «Витебский областной центр маркетинга» проводит повторный аукцион по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома								
3.	Земельный участок с кадастровым номером 221281205101000038, площадью 0,1699 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Вороновский с/с, д. Поляи, ул. Озерная, 5а	Земельный участок для индивидуального жилищного строительства	Наличие централизованного водоснабжения. Ограничения: охранная зона линии электропередач напряжением свыше 1000 В	469 349	45 000 бел. руб. р/с 3600314020012 в ф-ле № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 259, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: Вороновский сельский исполнительный комитет	1 116 000	2 692 867		21.01.2009 до 17.30
4.	Земельный участок с кадастровым номером 221285904101000147, площадью 0,1481 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Мазоловский с/с, д. Дреколье, ул. Лесная, 7	Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома	Инженерные коммуникации отсутствуют Ограничения: 1) охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В; 2) охранная зона линии электропередачи напряжением свыше 1000 В	349 440	34 000 бел. руб. р/с 3600314090013 в ф-ле № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 259, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: Мазоловский сельский исполнительный комитет	480 990	2 343 062	**27.01.2009 г. в 15.00** г. Витебск, ул. «Правды», 32, ККУП «Витебский областной центр маркетинга»	21.01.2009 до 17.30
5.	Земельный участок с кадастровым номером 221285904601000037, площадью 0,1016 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Мазоловский с/с, д. Дутчино, 18	Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома	Наличие централизованного водоснабжения. Ограничения: 1) водоохранная зона, участок находится в прибрежной полосе водоема р. Лужеснянка; 2) охранная зона линии электропередач напряжением до 1000 В; 3) земли, находятся в охранной зоне линии связи и радиофикации	457 660	45 000 бел. руб. р/с 3600314090013 в ф-ле № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 259, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: Мазоловский сельский исполнительный комитет	598 455	2 343 062		21.01.2009 до 17.30
6.	Земельный участок с кадастровым номером 221285901601000061, площадью 0,2331 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Мазоловский с/с, д. Букатино, 25	Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома	Наличие централизованного водоснабжения. Ограничения: охранная зона линии электропередач напряжением до 1000 В	900 000	90 000 бел. руб. р/с 3600314090013 в ф-ле № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 259, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: Мазоловский сельский исполнительный комитет	480 990	2 343 062		21.01.2009 до 17.30

Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории отсутствуют.

Победитель аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона, в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка в частную собственность внести плату за земельный участок; возместить расходы, связанные с подготовкой и проведением аукциона и расходы по подготовке документации, необходимой для его проведения; осуществить в двухмесячный срок после принятия решения о предоставлении ему земельного участка государственную регистрацию права собственности на земельный участок; получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство жилого дома; занять (освоить) земельный участок не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации права собственности на него.

1. Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 32, ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

2. Для участия в аукционе приглашаются граждане и юридические лица. Гражданин, юридическое лицо должны подать заявление об участии в аукционе и подписать соглашение с организатором аукциона. К заявлению прилагается:

- для граждан – копия документа, содержащего идентификационные сведения гражданина;

- для представителей гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;

- для представителей или уполномоченных должностных лиц юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении задатка.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Граждане, юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для земельного участка с наибольшей начальной ценой. Не допускается начало торгов по начальной цене. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет проданным земельный участок, а участника аукциона – победителем.

3. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра местности земельного участка, выставляемого на аукцион.

4. Физическое лицо, ставшее победителем аукциона обязано представить справку налоговых органов об источниках денежных средств при совершении сделки на сумму, превышающую 2000 базовых величин.

5. Победитель аукциона обязан оплатить расходы, связанные с подготовкой и проведением аукциона вне зависимости от дальнейшей оплаты за земельный участок в течение 3-х рабочих дней со дня проведения аукциона. В случае, если Победитель аукциона в установленный срок не внес плату за земельный участок, то внесенный победителем задаток и оплата расходов, связанных с подготовкой и проведением аукциона, расходов, связанных с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона, возврату не подлежат.

6. Контактный тел.: (0212) 47 97 35, e-mail: vcm74@mail.ru, www.vitinvest.biz

«Люблю сваю працу, люблю сваю дарогу, люблю сваю «Звязду»

Калі вы сачылі за нашымі справаздачамі, то ведаеце, што мы завезлі суперпрыз, халадзільнік, у Валожын; тэлевізары ў Пінск, Жлобінскі, Навагрудскі, Асіповіцкі раёны, і адзін уручылі падчас Рэспубліканскага дня падпісчыка на сталічным Галоўпаштамце. Ну вось, засталося 2 тэлевізары, дакладней, 2 падпісчыкі-шчасліўчыкі:

Фота Тамары РЫБАКОВАЙ.

САВЕЙКА Аляксандр з Шаркоўшчыны выпісвае «Звязду» ўжо гадоў 18 і пастаянна ўдзельнічае ў нашых розыгрышах. Такая настойлівасць ужо не аднаразова ўзнагароджвалася фартунай, але тэлевізар — гэта пакуль самы буйны прыз. Яго, дарэчы, у памяшканні Шаркаўскай пошты ўручыла Аляксандру Аляксандравічу начальнік раённага вузла сувязі РУТКОЎСКАЯ Кацярына Альфонсаўна.

А вось уладальнік «звяздоўскага» тэлевізара, разыгранага сярод падпісчыкаў Мінскай вобласці, жыве ў в. Ніва Узденскага раёна. Усё яшчэ КАЗЕЙ Сяргей Астапавіч пражыў у вёсцы, працаваў у лясгасе. З жонкай Галінай Рыгораўнай выгадаваў пяцёра дзяцей. Было вельмі прыемна напярэдадні святаў уручыць наш прыз са словамі падзякі за вернасць газеце і пажаданнямі здароўя, аптымізму і яшчэ доўгіх гадоў жыцця.

— А колькі вы дваро ў абыходзіце?

— Каля 65... Зараз у мяне 5 вёсак, а дзве вёскі за час маёй працы аджылі сваё... Вельмі шкада, і людзі многія ўжо памерлі, падпісчыкі харошыя. Раней у нас тут гаспадарка была і школа, а зараз толькі клуб і бібліятэка засталіся. Моладзі мала, падпісчыкаў усе менш становіцца. Але мы стараемся, працуем.

Ёсць вёскі, што стаяць на шляхах-бальшаках... Праз іх часта праязджаюць розныя машыны, заязджаюць людзі... Яны звычайна вялікія, з цагляны дыхтоўныі, бывае, што і двух-трох павярховымі будынкамі, са школай, дзіцячым садком, клубам, моладдзю на вуліцах... Сёння гэтыя вёскі ўсё часцей называюць па-моднаму, аграгарадкамі. У іх знаходзіцца цэнтр якой-небудзь гаспадаркі, у жыхароў там ёсць праца, ёсць заробак... Дзеці ўсё часцей вяртаюцца пасля вучобы ў горадзе жыць і працаваць сюды, бліжэй да бацькоўскай хаты.

Ёсць вёскі, якія лёс «закінуў» далёка ад шырокіх транспартных шляхоў... Каб у іх трапіць, даводзіцца доўга круціцца па вузкіх асфальтаваных, бетонных ці проста гравійных дарогах, якія перасякаюць доўгія кіламетры палёў і лясоў. У такіх вёсках звычайна адна-дзве вуліцы драўляных дамоў, многія з якіх ужо нежылыя, многія сталі дачамі і жывуць толькі з надыходам цёплых дзён. У такіх вёсках жывуць у большасці пенсіянеры і, зрэдку, немаведама дзе занятыя на працы ці зусім беспрацоўныя алкаголікі. Тут усе адно адналу сваякі, а самы часты госць у хаце — паштальён.

Ёсць людзі, якіх ніякі ніхто ніяк не можа пераканаць, што ім трэба ехаць у горад, да дзяцей, бо там ім будзе горш, чым тут, дзе ўсё знаёмае, родное, дзе ўсё жыццё прайшло. Ёсць людзі, якіх ніякія ўгаворы не могуць

НЕЗАПАТРАБАВАНАЯ ВЯРШЫНЯ

Да 210-й гадавіны з дня нараджэння Адама Міцкевіча

Усе ягоныя вершы — пра Радзіму: родную Літву. А ўсё ягонае жыццё — служэнне на хвалу Бацькаўшчыне. Хай сабе незваротна страчанай, але тым больш жаданай. «Прыпасці ў слязах да сырой зямлі, // Сляды цалаваць дарагія, // Хвароба гэтая ў дактароў // Завецца настальгія» (Г. Гейнэ). І гэты выбар, асэнсаваны і пройдзены ім да канца, не пакідаў яму анічога іншага, апроч несмяротнасці. Бо «жыццё кароткае — Радзіма вечная». Ці хай сабе іначай: «жыццё кароткае — Мастацва вечнае». І так яно ёсць пад вечным небам: збудаванае на Духу — неўміручае. Зямля навагрудская нарадзіла яго. 25-гадовым выгнаннікам ён прамераў абсягі расійскай імперыі, пасябраваў з Пушкіным. Правандраваў па Германіі, дзе ў Веймары наведаў старога Гётэ. Прайшоўся ля Капітолія плошчамі Вечнага места. Затрымаўся ў Парыжы. Жыццёвы шлях скончыў у Канстанцінопалі. Прах яго навекі спачыў у сталіцы Пястаў пад скляпеннямі каралеўскай рэзідэнцыі на Вавелі. Не жыўшы на зямлі Кароны (этнічнай Польшчы) — стаўся яе геніем.



Ніхто з паэтаў не мае, хіба, гэтулькі помнікаў, колькі пастаўлена вялікаму навагрудчаніну — звыш паўсотні. Помнік Адаму Міцкевічу ў Навагрудку (1987; пастаўлены ў 1991 г.). Аўтар — скульптар Валяр'ян Янушкевіч.

Такім быў зямны шлях паэта-рамантыка і пілігрыма Адама Міцкевіча. На тым пакутным шляху віфлеемскай зоркай яму зззяла Навагрудчына — Радзіма. Тут 24 снежня (на Куццю) 1798 года геній пабачыў свет. Ён прыйшоў, каб вырваць з нябыту цэлы край, што паволі занепадаў на задворках Еўропы, стаўшы геаграфічна ўскраінай царскай імперыі, якой пачала лічыцца Беларусь у выніку трох заборчых падзелаў канца XVIII ст. Занепадаў эканамічна, але не духоўна. Бо, як засведчылі яшчэ старажытныя грэкі, дзяржава павінна абапірацца больш на мужнасць духу, чым на сілу зброі. Дзякуючы таленавітым сынам (у сузор'і іх, апроч зоркі Міцкевіча, імёны Яна Баршчэўскага, Яна Чачота, Юзафа Крашэўскага, Уладзіслава Сыракомлі, Элізы Ажэшкі), зноў і зноў выплывала Атлантыда старадаўняй Беларусі-Літвы з еўрапейскай культурай. Атлантыда старажытная і вечна новая, бо нязводна хвалюючая. Краіна Вялікага Княства Літоўскага, якая за тры з паловай гады да нараджэння славянскага тытана слова ў выніку згаданых падзелаў перастала існаваць на карце Еўропы, — працягвала жыць у мастацкіх палотнах. Гэтаксама як працягвала жыць Карона — Рэч Паспалітая ў творах Ю. Славацкага, З. Красінскага, Ц. Норвіда, С. Жаромскага, Б. Пруса, Г. Сянкевіча, М. Канапніцкай...



Адзін з апошніх дагератыпаў Адама Міцкевіча. Пачатак 1850-х гадоў. Са збора музея Адама Міцкевіча ў Варшаве.

Праўдзіва: дзеці не выбіраюць сабе бацькоў, а паэты — народаў. Бацька генія Мікалай Міцкевіч, эканом, шляхецкі радавод якога пецярбургскі Сенат так і пакінуў пад пытаннем, зрабіўся адвакатам у Навагрудку, куды пераехала сям'я ў 1801 годзе, і змалку першая сталіца Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага стала для Адама зямлёй запаветнай. Адарваны ад яе падчас рэпрэсій над філаматамі-філарэтамі (1824-1825 гг.), ён ужо так і не бачыў больш Радзімы. Але яе непаўторныя краявіды сталі «нязводнымі снамі» (Янка Купала) для паэта, які ў салонным Парыжы высніў адну з найвялікшых славянскіх паэмаў «Пан Тадэвуш». Скрупулёзныя французскія бібліёграфы занатавалі выхад у свет «Пана Тадэвуша» 28 чэрвеня 1834 года. Наклад выдання склаў тры тысячы асобнікаў. У адрозненне ад папярэдняй кнігі «Дзяды. Частка III» (1832), якая на працягу двух гадоў двойчы перавыдавалася, новая кніга паэта разыходзілася вельмі марудна. Здарылася нават наступнае: калі ў 1838 г. рыхтаваўся першы збор твораў Адама Міцкевіча, выдаўцы яго ў V—VI тамах змясцілі «Пана Тадэвуша», змяніўшы папярэдне толькі вокладку экзэмпляраў першавыдання, што заставаліся на складах кнігарняў.

«Пан Тадэвуш» — вечна жывая кветка, перанесеная з парыжскага бруку на шляхетную Атлантыду Бацькаўшчыны. Колькі нябеснага нектару, зямнога водару, сыноўскай тугі і святла ў гэтай кветкі? Не ведаю. Спытайцеся ў жытніх хваляў, «у лугоў духмяных, Шырока над блакітным Нёмнам разасланых», у сонца, якое штодня ўзыходзіць, як у часы Адася, з-за волатаўскіх плячэй навагрудскіх узгоркаў над Вільняй, Завоссем, Рутай і Туганавічамі, над рунамі навагрудскага замка, над крыжамі Навагрудскага фарнага касцёла, дзе быў ахрышчаны Адам Бернард Міцкевіч — наш зямляк, наш суайчыннік, аўтар аднаго з найцудоўнейшых твораў сусветнай паэзіі.

У родным краі паэзія Адама Міцкевіча шанавалася свята. Трапяткі піітэт падтрымліваўся і тым, што ў адрозненне ад еўрапейскага чытача, жыхары найвялікшай імперыі (нават прадстаўнікі «пануючай» нацыі) былі пазбаўлены права вольна знаёміцца з творамі аўтара «Гражыны» і «Конрада Валенрода». Царскі ўрад спецыяльнымі загадамі ад 13 верасня 1834 г. і 14 красавіка 1839 г. забараніў перадрукоўваць выдадзеныя ў 1829 г. у Санкт-Пецярбургу вершы А. Міцкевіча і перавозіць у Расію аддрукаваныя ў Парыжы, Кракаве, Варшаве зборнікі паэта.

Смерць заспела генія 25 лістапада 1855 года ў далёкім Канстанцінопалі, дзе набіраліся апалчэнцы на змаганне з расійскім войскам. Цела вялікага Адама ляжала на знятых з завесаў дзвярах, як на катафалку. Паабапал палалі грамнічныя свечкі. І ляжаў той вялікі Літвін у чамарцы, з канфэдэраткай на галаве, як ваяр. Такі строй паплечнікі паэта абралі невыпадкова. «Вы насіце чамаркі паўстанцкія, і старыя, і маладыя, бо ўсе вы з'яўляецеся жаўнерамі паўстання Айчыны... І шмат хто з вас пампэ ў паўстанцкім строю. Таму няхай усе будуць гатовыя памерці». Смерць Адама Міцкевіча ў далёкай Турэччыне дазволіла яму вярнуцца на радзіму духоўна. Пра гэта сімвалічна выказаўся ягоны вялікі наступнік У. Караткевіч («Слова Міцкевічу (Верш у прозе)»): «Кажуць, што ў ноч на дваццаць шостае лістапада ты з'яўляешся на зямлю, якая цябе нарадзіла, і ходзіш па ёй, заглядаючы ў кожную хату...» І калі натрапіш на немаўля, дык тое дзіцятка «маўчыць і ўсміхаецца, бо яно бачыць тое, чаго не бачаць дарослыя: не прывід, а проста добры чалавек, толькі больш маўклівы, больш паглыблены ў сябе, нахіліўся над ім. А ты глядзіш на яго і калі бачыш, што сумленныя вочы ў яго бацькоў, даеш яму добры і сумленны лёс...»

І мяркуючы па тым, што ў краіне паэтаў не пераводзяцца паэты (наша зямля і напрыканцы XIX стагоддзя паўтарыла цуд, падараваўшы свету яшчэ аднаго Міцкевіча — Якуба Коласа), дух Міцкевіча апякуецца каханай Літвой-Беларуссю. Толькі са спадчынай ягонай, хацелася б, каб больш было азнаёмлена ягоных суродзічаў.

Глоткі, якія крычаць за народ,
збрыдзяць нарэшце народу,
Твары, якія цешаць народ,
палічыць народ за шкоду.
Рукі, што цягнуцца за народ,
народ адсячэ па локаць.
Імёнамі, што палюбіў народ,
будуць народ палохаць.
Стоміцца тлум і ацішыцца шум,
скрогат свае адбудзе,
Спадчыну ціха возьмуць сабе цемныя людзі.

(Пераклад Рыгора Барадуліна.)

На радзіме спадчына вялікага літвіна належным чынам пакуль не засвоена. «Беларускаму міцкевічазнаўству яшчэ трэба будзе вярнуцца да паэта, каб вярнуць яго не толькі ў кантэкст нашай гісторыі культуры, але і ў свядомасць яго землякоў — нашых сучаснікаў. Адам Міцкевіч гэта пакуль аддаленая ад нас вяршыня. Мы яе бачым і як быццам вызначаем абрысы, але не набліжаемся і тым больш не ўзыходзім на яе... Да Міцкевіча яшчэ трэба прыйсці. Яго творчасць — няспынны рух на вышыні чалавечага духу і разам з тым выпрабаванне беларускага духу польскаю моваю» (Ул. Мархель).

Праўдзіва: з усіх духоўных вяршыняў чалавецтва, што засталіся чалавецтву ў спадчыну ад XIX стагоддзя (Байран, Гётэ, Гейнэ, Міцкевіч, Пушкін, Шаўчэнка) — наш зямляк найбліжэйшы да нас. І не толькі па месцы нараджэння, але і па духоўнасці, скандэнсавана выяўленай у ягонай немалой спадчыне, па-ранейшаму ў нас невядомай, бо не запатрабаванай.

Язэп ЯНУШКЕВІЧ.

Святочны графік сталічных аб'ектаў гандлю

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў Галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама, на каталіцкія Каляды, 25 снежня, у сталіцы плануюць працаваць усе гарадскія рынкі. Панядзелак традыцыйна лічыцца для рынкаў выхадным днём, але 29 снежня работнікі пераважнай большасці сталічных рынкаў, у тым ліку і Камароўскага рынку, не збіраюцца «адпачываць». Сваім законным выхадным збіраюцца скарыстацца 29 снежня работнікі Цэнтральнага рынку будаўнічых матэрыялаў, рынкаў «Шабаны», «Гандлёвыя рады», «Свелта» і Гандлёвага дома «Ждановічы». 1 студзеня ўсе рынкі будуць для пакупнікоў закрытыя. А 5 студзеня (зноў у панядзелак) будуць працаваць рынкі «Ракаўскі кірмаш», «Велазаводскі», «Уральскі», Камароўка і «Мінскі вернісаж».

Крамы па продажы харчовых тавараў 25, 31 снежня і 7 студзеня будуць працаваць па рэжыме працоўнага дня, а 1 студзеня — з 10 да 18 гадзін. У сталічных крамаў па продажы нехарчовых тавараў 25 снежня, 1 і 7 студзеня — выхадны дзень. Аб'екты грамадскага харчавання (рэстараны і кавярні) з 15 снежня і да 1 студзеня працуюць штодня без выхадных да 6 гадзін раніцы, за выключэннем аб'ектаў, размешчаных у памяшканнях, убудаваных у жылыя будынкі.

Набыць жывую ёлку ў Мінску можна ў гэтыя дні на ёлачных кірмашах па наступных адрасах: Савецкі раён — вул. Я. Коласа, 67, Кастрычніцкі раён — вул. Казінца, 6а, Заводскі раён — вул. Ангарская, 36, Ленінскі раён — праспект Ракасоўскага, 2, Партызанскі раён — бульвар Трактарабудаўнікоў, Фрунзенскі раён — вул. Панамарэнкі, 32 і Прытыцкага, 42; Маскоўскі раён — праспект газеты «Праўда», 40; Цэнтральны раён — вул. Няміга, 8; Першамайскі раён — вул. Шугаева, 3/1.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Нічога не змянілася

Нягледзячы на крызісныя страсці, на прадпрыемствах горада істотна нічога не змянілася. Пракаментавала сітуацыю **начальнік упраўлення эканомікі і рыначных адносінаў Баранавіцкага гарвыканкама Раіса УЛАСОВІЧ:**

— Затрымак з зарплатай на 21 снежня няма, ва ўсякім разе ніякай інфармацыі наконт нейкіх збояў з зарплатай з прадпрыемстваў не паступала. Што датычыцца святочных канікул, то ў кожным калектыве свой графік, і тут няма нейкіх жорсткіх агульных рамак. Напрыклад, калектыў станкабудаўнічага АТ «Атлант» будзе адпачываць з 25 снежня па 7 студзеня, а аўтаагрэгатны завод — з 25 снежня па 4 студзеня. Пакуль што абстаноўка не выклікае вялікай трывогі.

Калі ў горадзе на нейкім прадпрыемстве не выплачваюць зарплату ці яно закрываецца, то пра гэтую навіну ўсе ведаюць. На сённяшні дзень усё спакойна.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Считать недействительными страховые свидетельства по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии АЖ №№ 3523303, 3523304, 3523305, 3523306; страховые полисы по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БМ №№ 0163301, 0163302, 0163303; страховой полис по договорам страхования, заключаемые физическим лицом (форма 2РН), юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем (форма 2РП) по страхованию иному, чем страхование жизни формы 2РН, 2РП серии БК № 0034051. СООО «Белкоопстрах» в связи с их утерей.

СООО «Белкоопстрах» в г. Могилеве.

У мінулыя выхадныя давялося наведацца на Цэнтральны рынак Гомеля. Народу там таўклося даволі многа. Куды болей, скажам, чым два тыдні таму. І гэта цалкам зразумела: людзі занятыя перадnавагоднімі клопатамі.

На што звярнуў асаблівую ўвагу, дык гэта на тое, што тавараў там было самых розных, на любы густ. Пастараліся спажывецкія таварыствы з некалькіх раёнаў, дзе цэны былі куды меншымі, чым унутры самога рынку. Напрыклад, пекінская капуста па 2800 рублёў (адпаведна 3700) за кілаграм, яблыкі — 1890—2500 рублёў супраць (2700—3500), філе марскога языка — 8700 (9500) рублёў і вышэй за той жа кілаграм. Адсюль і павышаны попыт.

Учора спецыяльна схадзіў у гандлёвыя рады, што каля чыгуначнага і аўтавакзала. А там цэны на такія ж прадукты харчавання нават вышэйшыя. Чуў размову жанчыны са Жлобіна з прадаўшчыцай аднаго ларка: думала купіць сёмгі ў вас, што па праспекце Леніна, і яе запэўнілі, што ў вас таксама. Ды і ў іншых ларках, дзе прадаюць сёмгу, цана амаль такая ж. Ды і ў буйных гандлёвых комплексах, дзе сёмга таксама ёсць, цана не вельмі адрозніваецца.

НАВАГОДНІ ШОП-2009

Будзе пасля Новага года падаць беларускі рубель ці не? Спажывец на гэтае жыццёвае пытанне адказвае некалькімі варыянтамі паводзінаў перад Новым годам-2009.

Першы такі: на тыя грошы, што выпадкова апынуліся ў заначцы, трэба купіць усё, што будзе служыць доўгі час. Таму тыя, хто доўга збіраўся, сёння хутка купляюць халадзільнікі, пральныя машыны і тэлевізары. «Так хоць грошы не прападуць», — мяркуюць яны, узгадваючы вопыт 90-х.

Новы год — толькі з пахам хвоі ад ёлкі на цэнтральнай плошчы. Абыдземіся без ананасаў. Нічога не траціць, толькі збіраць, і пажадана ў доўгую панчоху. Грошай не так многа — а хацелася б, каб хоць гэтыя не зніклі. Што ж з імі рабіць??? Некаторыя ўпэўнены, што крызіс зацягнецца, і таму можна выгадаць на дзяржаўных прапановах не забіраць грошы з банкаў, а ўкладаць іх пад высокія працэнты — сёння гэта сапраўды так. І яны маюць рацыю.

Раптам зноў узніклі чэргі на беларуска-ўкраінскай мяжы. Сталі папулярнымі шоп-туры ва Украіну. Чаму не, калі суседняя краіна куды бліжэй, чым Мінск, а грыўна там хістаецца, як апошні ліст на галінцы. Між тым ходзяць чуткі, што беларусы ў Чарнігаве ўжо выграблі ўсё, што маглі, таму за таварамі трэба ехаць далей ад мяжы. Цікава, што курс грыўны вагаецца ў залежнасці ад таго, у будны ці выхадны дзень прыедзеш па тавар. У будны, кажуць, курс вышэйшы. Тыя, хто ездзіў, шкадуюць толькі, што нашы мытныя законы не даюць магчымасці моцна разагнацца. А вось калі толькі для сябе і родных — вельмі выгадна атрымліваецца.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Ад крызісу збегчы ў паэзію

Найбуйнейшае недзяржаўнае брэсцкае выдавецтва «Альтэрнатыва» працуе ў звычайным рытме. Зарплата і аванс выдаюцца рэгулярна, да Новага года работнікам налічваецца прэмія. Як расказала дырэктар прадпрыемства Лілія Уцюкова, зараз яны працуюць над выцворчасцю рэкламна-плакатнай літаратуры да 600-годдзя Белавежскай пушчы, 65-годдзя абласной бальніцы, юбілею іншых прадпрыемстваў. Толькі што выйшлі ў свет зборнік паэзіі юных аўтараў «Адкрыццё», падрыхтаваны абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі, і цікавая кніжка двух аўтараў, Корачкінай і Вакулы, «Зубр Белавежскай пушчы». Людмілы Корачкінай ужо няма з намі, але яна пакінула найцікавейшыя ўспаміны пра тое, як узнаўлялі страчаную папуляцыю зубра ў пушчы, яна ўзначальвала гэту работу.

Як заўважыла Лілія Іванаўна, замоваў хапае. У гэтым годзе крыху менш замаўляюць прадпрыемствы сваіх фірменных календароў. А вось паэзіі і прозы самадзейныя аўтары нясуць болей. Паводле назіранняў дырэктара выдавецтва, ад фінансавых цяжкасцяў многія спрабуюць схавацца ў творчасці. Вершы пра каханне прыносяць хатнія гаспадыні і гандляры. Такія творы выдавецтва аддае на рэцэнзію ў Саюз пісьменнікаў або на адпаведную кафедру ўніверсітэта. Трапляюцца вельмі слабыя творы, але бываюць і шчырыя, жывыя радкі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Гандаль ажывіўся

карыстаючыся паездкай у абласны цэнтр, дык не буду — у нашым горадзе яна такая ж самая з выгляду, але таннейшая.

У другой прадаўшчыцы ўжо я пацікавіўся, як ідзе гандаль рыбнай прадукцыяй у гэтыя перадсвяточныя дні, і пачуў: не вельмі актыўна. Як і раней. А вось з аўтатранспарту рыбгаса «Трэмля», што за 50 метраў ад вашага ларка, сказаў я ёй, рыба прадаецца так, што чарга ўтварылася пры мне. Белы амур і буйны карп — па 7700 рублёў за кілаграм, таўсталобік (яго ўжо раскупілі) — па 6900, карп сярэдні — 6900 і меншы — 5600 рублёў. За два апошнія дні з той машыны прадаецца да паўтоны і больш рыбы. Дык што ж вы хочаце, быў адказ той прадаўшчыцы: там жа рыба жывенькая і таннейшая. А ў нас — марожаная. І даражэйшая.

Зайшоў у вялікую краму № 3, што па праспекце Леніна, і яе загадчыца сказала, што выручка ў апошнія два дні ўзрасла ледзь не на 30 працэнтаў. Добра ідуць у продаж сокі, куры, каўбасы, філе рыбы. І калі філе чырвоных відаў рыбы прыцягвае ўвагу пакупнікоў, дык суцэльнай рыбіны — не: дарагавата. Беларуская прадукцыя прадаецца, як сказала Святлана Яўгенаўна, «на ўзроўні вачэй». Усё відаць, яна — прыкметная. А вось продаж малочнай прадукцыі знізіўся.

Зазірнуў і ў гандлёвы комплекс «Галерэя», што нядаўна адчыніўся на вуліцы Катуніна. З размоў жанчын: прамысловыя тавары з-за мяжы дарагаватыя. У гаспадарчых крамах ніякага ажыятажу не заўважыў. Напэўна, не сезон. Прыкінуў цэны на розныя тавары і ва ўкраінскіх «чаўнакоў». Яны нізкэйшыя, чым нашы. У цэлым жа — абы грошы былі. Купіш усё, што трэба. Дык, маўляў, які тут крызіс?

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

«Лепш дарыце цукеркі!»

Падрыхтоўка да Новага года ідзе па-рознаму. На прадпрыемствах, напрыклад, падбіваюцца фінансавыя справаздачы, падводзяцца ўвогуле вынікі — што атрымалася, што не. Адно з вядучых прадпрыемстваў у Гомельскай вобласці, якое займаецца дрэваапрацоўкай, — адкрытае акцыянернае таварыства «Гомельдрэў». Як паведаміў намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай і кадравай рабоце Анатоль БОБРЫК:

— Збіраемся на канікулы з 1 па 11 студзеня. У нас рынкі збыту на 80 працэнтаў арыентаваныя на Расію. Расіяне сыходзяць на канікулы, і нам не мае сэнсу дарэмна ганяць прадпрыемства. А так будзе эканомія энерганосьбітаў. Зараз мы адчулі напружанне ў рабоце з расійскімі партнёрамі. Продаж ідзе не так бойка, як раней. Што датычыцца сітуацыі па Беларусі — тут усё нармальна, як звычайна. У цэлым жа пакуль рабочы рытм не парушаўся і зрываў з выплатамі заробкаў не было. Перад навагоднімі канікуламі людзі абавязкова атрымаюць грошы. Жыццё падкажа, як будзем жыць далей.

На пытанне, ці будуць змены ў рабоце вашага прадпрыемства напярэдадні Новага года, **дырэктар рэспубліканскага алмазаперапрацоўчага ўнітарнага прадпрыемства «Гомельскае ВА «Крышталь» Анатоль ГОЛІСЕЎ** адказаў пытаннем: «Якія адносіны газета «Звязда» мае да графіка работы прадпрыемства?» І адмовіўся гаварыць, ці дарыць любімым брыльянты на Новы год — лепш дарыце цукеркі, іх ацэняць абавязкова і малыя і старыя. Прадукцыю сумеснага прадпрыемства **адкрытага акцыянернага таварыства «Спартак»** атрымаюць у якасці падарунка многія маленькія жыхары краіны. **Намеснік дырэктара Ірына ЖУКАВА** кажа, што да свята пачалі рыхтавацца, як звычайна, у красавіку.

— Яшчэ вясной пралічваюцца меркаваныя аб'ёмы продажу, вызначаюцца накірункі, па якіх мы будзем працаваць у навагоднія дні, загадзя размяшчаюцца замовы на дызайн, на ўпакоўку, прапрацоўваецца асартымент навагодніх падарункаў. Новы брэнд прадпрыемства «Melanie» пакуль не будзе адлюстраваны на навагодняй прадукцыі, бо ён уводзіўся пазней за 20 верасня, калі пачалі рабіць салодкія падарункі. Сёння прадпрыемства па-ранейшаму загружана, мы працуем у звычайным рэжыме і не збіраемся даваць водпускі сваім супрацоўнікам у пачатку студзеня. Наш асартымент запатрабаваны, і ён заўсёды павінен быць на прылаўках магазінаў. Заработная плата будзе выплачана своечасова і загадзя — ужо 24 снежня.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

НА ХУТАРЫ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Натуральна, хутаране змогуць разлічваць на падтрымку дзяржавы ў тым плане, што ім, як і іншым жыхарам вёскі, могуць выдзяляцца льготныя крэдыты на будаўніцтва жылля. А калі да таго ж хутаранін з'яўляецца работнікам СВК, дык і іншыя льготы.

На думку першага намесніка міністра, «хутар пажадана будаваць пад сям'ю, якая хацела б мець свой невялікі зямельны ўчастак і апрацоўваць яго ўсёй сям'ёй». Каб праца на хутары не была цяжкім ярмом, у рэспубліцы вырабляецца нямала міні-тэхнікі для фермерскіх гаспадарак, якую меркаваны хутаранін як фермер або ўладальнік хутара зможа набыць на пэўных, магчыма, ільготных умовах.

Надзея Каткавец падкрэсліла: «Мы прыхільнікі замацавання за сям'ёй уладальніка хутара зямельнага ўчастка або ў доўгатэрміновай арэндзе, як яна на сёння знаходзіцца ў фермераў, або ў карыстанні, як у СВК. Іншых варыянтаў пакуль няма. Галоўнае, на хутары павінен жыць і працаваць гаспадар, нераўнадушны да праблем сельскага ладу жыцця чалавек».

Гэта зусім не азначае, што са стварэннем хутароў пойдзе адток з СВК, аграгарадкоў. «Мы далёкія ад думкі, што аднаўленне хутароў набудзе масавы характар. Трэба, каб да перасялення ў хутары людзі ішлі сваім шляхам, зусім свядома, каб да гэтага прыйшлі тыя з іх, хто даўно марыў жыць на хутары», — падкрэсліла першы намеснік міністра.

У цяперашніх умовах чалавек па натуры сваёй не можа жыць адасоблена ад іншых, таму хутаране павінны і будуць карыстацца ўсімі выгодамі цывілізацыі, сказала Надзея Каткавец. Безумоўна, яны павінны быць упэўненыя, што іх дзеці будуць наведваць школу, а на іх хутар у любое надвор'е заверне аўталаўка. Натуральна, ніякі камп'ютар або спадарожнікавая антэна не заменяць чалавечых зносінаў і жывога ўспрыняцця музыкі, тэатра. Хутаране як новая сацыяльная катэгорыя абсалютна здольныя папоўніць шэрагі сельскай інтэлігенцыі, таму што першапачаткова такая новая справа пад сілу пераважна людзям адукаваным і смелым, якія ўмеюць рызыкаваць.

«Мы хочам выхоўваць гаспадара на зямлі, і адраджэнне хутарскога вядзення сельскай гаспадаркі — адзін са спосабаў дасягнення гэтай мэты», — лічыць Надзея Каткавец. Ахвотныя заснаваць свой хутар могуць разлічваць на дзяржаўную падтрымку, найперш на дапамогу ў жыллёвым будаўніцтве. За кошт ільготных крэдытаў, выдадзеных на 40 гадоў, у сельгасарганізацыях сёння будуюць жыллё. Хутаранін як член СВК, таксама будзе карыстацца гэтымі льготамі. Безумоўна ж, хутарская зямля, якая будзе выдзяляцца хутараніну, таксама будзе належаць сельскагаспадарчай арганізацыі, якая можа ўзяць крэдыт і будаваць для хутаран жыллё. Калі знойдуцца людзі з ліку гараджан, ахвотных жыць на хутары, то ў гэтым таксама няма асаблівых праблем. У раённых упраўленнях сельскай гаспадаркі і харчавання заўсёды знойдуцца спецыялісты-кансультанты, якія дапамогуць арганізаваць справу. Галоўнае, было б жаданне. Уладальнікі хутара, гэтак жа як і іншыя жыхары вёскі, будуць мець магчымасць здаваць малако ў гаспадарку і атрымліваць сродкі на набыццё таннага камбікорму і сена для ўтрымання сваіх дойных кароў.

Першы намеснік міністра адзначыла, што ў сельскай мясцовасці ёсць яшчэ нямала свабодных участкаў зямлі, дзе можна ствараць хутар, пабудаваць дом, арганізаваць справу, адрадзіць рамёствы, абуладкаваць зямлю, вярнуць да жыцця былыя няўдобіцы. Спецыялізацыя хутаран можа быць таксама рознай — ад вырошчвання бульбы і гародніны да вырошчвання прамысловага саду, суперэліты збожжавых. Кожны хутар можа адрознівацца ад іншых сваім рамяством: адзін будзе славіцца тым, што там выпякаюць смачны хлеб на дубовых і кляновых лістах, іншы — ткацтвам і пляценнем сувеніраў з саломкі, трэці — кавальскай справай ды ганчарным майстэрствам. Словам, лад жыцця на хутарах будзе хоць і вясковым, але сучасным і эфектыўным.

Хутар — гэта адасоблены зямельны ўчастак з сядзібай уладальніка хутара або аднадворавае сельскае пасяленне. У Беларусі з XIX стагоддзя гэтая назва часцей за ўсё ўжывалася ў адносінах да фальварку. Хутарская форма землекарыстання з'явілася пасля адмены прыгоннага права і атрымала развіццё ў пачатку XX стагоддзя ў выніку сталыпінскай аграрнай рэформы. У 1906—1916 гадах было ўтворана каля 130 тыс. хутароў і адрубоў (12 % усіх сялянскіх гаспадарак). У 1921—1926 гадах хутары ствараліся і ў БССР. Да 1925 года каля 25 % сялянскіх гаспадарак размяшчалася на хутарах. У Заходняй Беларусі ў выніку аграрных рэформ 1920—1930 гадоў, накіраваных на развіццё капіталізму, на хутарах да 1939 года было выведзена каля 70 % гаспадарак. Масавае перасяленне калгаснікаў з хутароў у вёскі правадзілася ў 1938—1940 гады, у Заходняй Беларусі — у пасляваенны перыяд. З 90-х гадоў мінулага стагоддзя развіццё фермерскіх гаспадарак у асобных выпадках садзейнічае адраджэнню хутароў.

Як сведчыць гісторыя, у адносінах да беларускіх уладальнікаў хутароў былі таксама дапушчаны сур'ёзныя перагібы. Заможных хутаран лічылі кулакамі, а некаторых як «ворагаў народа» ссылалі ў Сібір. Таму ў многіх беларусаў, хто пережыў тыя нялёгкія часы, адносіны да стварэння хутароў будуць неадназначнымі, і, магчыма, гэтая ідэя па першым часе не знойдзе разумення. Але часы мяняюцца. Уладальнік хутара ўжо даўно перастаў быць «ворагам народа», таму што, як высветлілася, менавіта ў хутарской сістэме чалавек па-сапраўднаму разумее значэнне ўласнага ўчастка зямлі, і ў яго выхоўваецца пачуццё гаспадара той зямлі, дзе ён жыве, працуе, выхоўвае дзяцей, адпачывае.

ПОЎДЗЕНЬ

Агульная ацэнка поўдня ў традыцыйнай культуры ўсходніх славян, хутчэй за ўсё, негатыўная. Ён не ўспрымаецца сам па сабе, як самадастатковая адзінка часу, а знаходзіцца ў непарыўнай сувязі са сваёй супрацьлегласцю — апоўначчу. У той жа час, поўдзень у некаторых сітуацыях меў станоўчае, духоўнае значэнне. Гэта тлумачылася тым, што ў гэты момант няма ценяў, якія заўсёды сімвалізавалі зло.

● Рытуальна-абрадавыя кантэксты сведчаць пра тое, што поўдзень быў своеасаблівым паваротным пунктам у выкананні абрадаў пераходнага тыпу.

● Зажынкі звычайна пачыналі апоўдні. Але ў іншых сітуацыях працаваць апоўдні ў полі (касіць, жаць) катэгарычна забаранялася, інакш нападзе Палудніца. У адным з паданняў сказана наступнае: «Палудніца — прыгожая дзяўчына, апранутая ва ўсё белае, з доўгімі валасамі колеру пшаніцы. Летам, у час жніва, яна ходзіць па палях, і калі хто ў самы поўдзень працуе, карае яго моцным болем у шыі ці паясніцы...»

● Народная мудрасць адзначае: калі першыя грымоты чуваць апоўдні, то лета будзе цёплае і гарачае.

● Акрамя таго, першыя грымоты днём прадказвалі, што жыць у гэты год будзе лёгка, калі ж грымоты разбудзяць зямлю ноччу, то гэта лічылася прадказаннем цяжкага для жыцця года.

● Рытуальныя магічныя дзеянні, накіраваныя на кардынальнае змяненне сітуацыі, трэба было праводзіць апоўдні. Напрыклад, каб вярнуць мужа, жонцы неабходна было чытаць 12 дзён у вянчальны час (г.зн. а 14-й гадзіне) наступную замову: «Пускаю па ветру, па харошаму прадмету; як етага след ляжыць, так нікуды (імя) не пабяжыць. Як етага следу ніхто не змяце, так ніхто маго мужа ад мяне ні адбярэ. Як ля мае рубахі дзяржыцца рубец, так мо муж дзяржыцца за міне, і ніхто яго (рубца) не атнімя, так ніхто майго мужа не возьме. Дзяржыць мой пояс ля мяне, так ніхто майго мужа не атнімя ад мяне. Спяку я скавароднік маладзікі, даю табе заправы ад сябе, штоб ты не пабег нікуды ад мяне. Даю водку, водку ад паяса, штоб не любіў чужога ліца».

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Дзве даты

24 снежня

1784 год — нарадзіўся (вёска Гайна Лагойскага раёна) Зарыян Якаўлевіч Даленга-Хадакоўскі, славянаznаўца, заснавальнік беларускай, рускай, польскай і ўкраінскай археалогіі, фалькларыстыкі, этнаграфіі і дыялекталогіі. Менавіта Даленга-Хадакоўскі ўпершыню ў Беларусі правёў археалагічныя раскопкі і даследаванні гарадзішчаў у Полацку, Віцебску, Тураве, Бабруйскім павеце і іншых месцах. Адначасова рабіў запісы фальклору, мясцовых дыялектаў і абрадаў. Вынікам гэтай дзейнасці стала праца «Аб славяншчыне да хрысціянства». Вядома, што Даленга-Хадакоўскі зрабіў шэраг заўваг, звязаных з фактамі беларускай гісторыі, да першага выпуску «Гісторыі дзяржавы Расійскай» Мікалая Карамзіна, якія апошні ўлічыў у наступных выданнях.

1989 год — II З'езд народных дэпутатаў СССР асудзіў Пакт Молатава-Рыбентропа, заключаны Савецкім Саюзам і Германіяй у 1939 годзе.

Цытата дня

«Можна даказаць жанчыне, што яна не мае рацыі, але нельга пераканаць яе ў гэтым».

Джон Чэртан Колінз (1848—1908), англійскі крытык.

Усміхнёмся!

Ганна Семяновіч заявіла, што ў выпадку небяспекі яна зможа грудзьмі захінуць сваё дзіця, мужа і ўсіх сваякоў па матчынай лініі.

☺

Два прыяцелі:

— Нейкі ты сёння бледны, ды і не так выглядаеш. Стрэслася што?

— Ды разумееш, ехаў я ў метро на эскалатары, і задумаўся.

— Ну і што?

— Ну і пракаціўся тры разы...

☺

Толькі калі мы пачалі жыць разам, я зразумею, што па начах я ўсё ж храпу...

☺

Біл Гейтс кінуў Microsoft і заняўся вытворчасцю аўтамабіляў. Цяпер у яго аўто пры націсканні на педаль тормаза на панэлі будзе высвечвацца паведамленне: «Вы сапраўды хочаце затармазіць?».

Открытое акционерное общество «Минский подшипниковый завод»

ОБЪЯВЛЯЕТ МЕЖДУНАРОДНЫЙ КОНКУРС

по выбору стратегического партнера для реализации инвестиционного проекта «Техническое перевооружение открытого акционерного общества «Минский подшипниковый завод».

Информация о конкурсной документации находится
на сайте ОАО «МПЗ» www.mpz.com.by
в разделе клиенты-тендеры.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.27	15.51	7.24
Віцебск —	8.24	15.33	7.09
Магілёў —	8.17	15.41	7.24
Гомель —	8.05	15.47	7.42
Брэст —	8.41	16.08	7.27
Гродна —	8.33	16.17	7.44

Месяц

Апошняя квадра.
Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

Пр. *Данілы, Івана, Лукі.*
К. *Евы, Ірмы, Эвеліны, Адама, Рыгора.*

Адкрытае акцыянернае таварыства «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман»:

ПАЎТАРАВЕКАВЫЯ ТРАДЫЦЫІ ЯКАСЦІ, ПРАВЕРАНЫЯ ЧАСАМ

АЙЧЫННАМУ ФЛАГМАНУ Ў СВАЁЙ ГАЛІНЕ — 148 ГАДОЎ

Гэта было нядаўна...

На постсавецкай прасторы на пальцах можна пералічыць прадпрыемствы, карані якіх непасрэдна звязаны з гісторыяй сярэдніх вякоў. А на тэрыторыі нашай рэспублікі — тым больш. Праўда, нават невялікія докі мінуўшчыны здагадаюцца, што размова можа ісці пра тытунь і ўсё, што з ім звязана. Важнасць яго ў развіцці чалавечай цывілізацыі цяжка пераацаніць. Чаго толькі варты ўстойлівы выраз «трубка мира», што азначае парадак у любой справе, ці як знак вырашэння спрэчных пытанняў...

Яркім прадстаўніком тытунёвага бізнэсу ў Беларусі, распачатаму некалі Хрыстафорам Калумбам для Еўропы, з'яўляецца ААТ «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман».

Дзень сённяшні

Сёлетні год для Гродзенскай «табачкі», як яе з любоўю называюць у народзе, лічыцца паспяховым. Па-першае, прадпрыемства змяніла форму ўласнасці, і як стагоддзе таму, стала акцыянерным таварыствам. Па-другое, датэрмінова, амаль на 5 месцаў раней, цалкам пагашаны дзяржаўны крэдыт, які ў свой час быў узяты для стабілізацыі фінансава-эканамічнага становішча на прадпрыемстве. Зрэшты, тут варта нагадаць, што «крэдытная гісторыя», якая ўжо завершана, пачалася пасля 2002 года, калі на ГТФ «Нёман» пад дзяржаўным патранатам на працягу амаль трох гадоў прайшла грунтоўная рэканструкцыя. Абышлася яна дзяржаве ў 48 мільярдаў рублёў. Тым не менш, гэтае буйнамаштабнае фінансаванне ўліванне належнай аддачы не прынесла: збыт прадукцыі змяншаўся, і фабрыка страчвала пазіцыі на рынку. Як вынік, аб стабільнасці ў вытворчым працэсе прадпрыемства давялося забыць.

Для выхаду з наяўнай сітуацыі з прыходам новага кіраўніка ГТФ Юрыя Чарнышова была распрацавана стратэгія развіцця прадпрыемства, якое па сваіх вытворчых магутнасцях і па магчымасцях проста павінна было стаць лідарам на айчынным рынку ў сваёй галіне. Пры падтрымцы Прэзідэнта краіны і Урада рэспублікі былі распрацаваны асноўныя накірункі развіцця ГТФ. Сярод зробленых захадаў, якія аказаліся вельмі эфектыўнымі, — адказ ад паслуг пасрэднікаў пры закупцы сыравіны і матэрыялаў. Да таго ж кіраўнік дзяржавы адтэрміноваў да 2007 года аплату падатковага крэдыту ў дзяржбюджэт. А яшчэ, што таксама было вельмі важным звяном пры выхадзе з крызісу, — фабрыка атрымала ад дзяржавы «дабро» не выконваць прагнозныя паказчыкі на 2005 год, паколькі на той час склады былі забітыя гатовай прадукцыяй на суму 52 мільярды рублёў, якую трэба было неадкладна рэалізаваць. Усе зробленыя захады былі правільнымі, і зараз ГТФ «Нёман» развіваецца як стабільнае і дынамічнае прадпрыемства, мае на мэце асваенне ўсё новых рынкаў і пашырэнне наменклатуры выпускаемай прадукцыі.

Сума адтэрміноўванага падатковага крэдыту ў 2008 годзе склала 24 мільярды рублёў, у 2007 годзе — 25 мільярдаў рублёў. Пры гэтым агульная сума надзённых падаткаў, якую заплаціць ГТФ «Нёман» у дзяржаўны бюджэт, за гэтыя два гады складзе звыш 220 мільярдаў рублёў. Для параўнання: у 2005 годзе было ўплачана 50 мільярдаў рублёў крэдыту.

Сёння ГТФ «Нёман» працуе з поўнай загрузкай і забяспечвае работай звыш 1000 чалавек, якія маюць значны вопыт працы ў тытунёвай прамысловасці. У тым ліку кіруючы састаў — з лепшых айчыных упраўленцаў

ААТ ГТФ «НЁМАН» — сучаснае высокатэхналагічнае прадпрыемства. Укараненне новага абсталявання датычыцца тут рабочых і спецыялістаў з розных участкаў. Гэтыя фотаздымкі знаёмяць з выканаўцам абавязкаў галоўнага інжынера Дзмітрыем СТАНКЕВІЧАМ і выканаўцай абавязкаў начальніка лабараторыі Валянцінай КЛАЧКО. Фотааб'ектыў зняў іх у цэху каля новай лініі.

Імпартазамяшчэнню — шырокую дарогу ў рамках дзяржаўнай праграмы

Супрацоўніцтва ГТФ «Нёман» і ЗП «Брыціш-Амерыкан Табако ТрэйдынгКомпані»

На беларускім прадпрыемстве лічаць супрацоўніцтва з сусветнавядомай кампаніяй узаемавыгадным, бо вялікі вопыт БАТа дазваляе палепшыць якасць і бяспеку прадукцыі, якая вырабляецца на ГТФ «Нёман».

У 2007 годзе кампанія «Брыціш Амерыкан Табако» інвеставала ў вытворчасць фабрыкі для закупкі новага абсталявання звыш 2 мільёнаў еўра.

- **2005 год**, чэрвень — пачатак кантрактнай вытворчасці міжнароднай маркі Alliance.
- **2006 год,** май — пачатак кантрактнай вытворчасці міжнароднай маркі Vicerоy (Вайсрой).
- **2007 год**, чэрвень — пачатак кантрактнай вытворчасці міжнароднай маркі Pall Mall.
- **2007 год**, жнівень — пачатак кантрактнай вытворчасці міжнароднай маркі Lucky Stricke.
- **2008 год** — пачатак кантрактнай вытворчасці міжнароднай маркі Kent.
- **2009 год** — намеры па вытворчасці прадукцыі фармату Super Slim.

Працэс кантрактнай вытворчасці кантралюецца пастаянна. На ГТФ «Нёман» прысутнічаюць спецыялісты кампаніі БАТ, якія інспектуюць усю тэхналогію — пачынаючы з прыёмкі сыравіны і заканчваючы адгрузкай гатовай прадукцыі. Акрамя таго, прадстаўнікі кампаніі «Брыціш Амерыкан Табако» перыядычна прыязджаюць і робяць адбор прадукцыі ў гандлёвых кропках Беларусі. Затым праводзяцца выпрабаванні ў лабараторыях Расіі і Германіі на адпаведнасць патрабаванням якасці кампаніі. У выпадку адхілення вытворчасць была б спынена. Такіх выпадкаў на ГТФ «Нёман» не было...

На ААТ ГТФ «Нёман» сцвярджаюць, што дарога на прадпрыемства ні для каго не перакрыта. Адзін з крытэрыяў выбару — дэманстрацыя бізнэс-плана з умовамі вытворчасці і прысутнасці на выгадных для дзяржавы і фабрыкі ўмовах.

Якасць — перш за ўсё

Сучасны тытунёвы рынак адэкватна рэагуе толькі на якасную прадукцыю. Асноўны паказчык якасці — гэта попыт. Для дасягнення гэтай мэты на ГТФ праводзіцца сур'ёзная работа па распрацоўцы асартыментнай палітыкі ў рэчышчы агульнасусветных тэндэнцый рынку. Вядома, што для яго характэрнае павелічэнне прапановы на прадукцыю з паніжаным утрыманнем шкодных рэчываў. Зараз з мэтай зніжэння шкодных рэчываў фабрыка ўдасканаліла сваю вытворчасць. Такая аперацыя абышлася прадпрыемству ў 300 тысяч еўра. Праўда, дзякуючы такому захаду будуць выкананы патрабаванні Еўрапейскай канвенцыі па барацьбе з курэннем. Акрамя таго, закуплена абсталяванне, якое вызначае паказчык угарнага газу (CO) у прадукцыі. І яшчэ: для дасягнення максімальна магчымых патрэбаў спажыўцоў, падтрымання пастаяннага высокага ўзроўню якасці выпускаемай на фабрыцы прадукцыі, ва ўсіх абласны цэнтрах створаны грамадскія дэгустацыйныя камісіі. За якасцю вырабаў строга сочаць і на самім прадпрыемстве. Гэта — дэгустацыйная група, якая складаецца з галоўных спецыялістаў.

Адным з немалаважных фактараў, якія пацвярджаюць высокую якасць прадукцыі, з'яўляецца атрыманы ГТФ сертыфікат на адпаведнасць сістэмы менеджменту якасці міжнародным стандартам серыі ISO 9001-2001, які зарэгістраваны ў Нацыянальнай сістэме сертыфікацыі Рэспублікі Беларусь і ў нямецкай сістэме акрэдытацыі TGA.

Прадукцыя ГТФ «НЁМАНА» і ўмовы яе выпуску высока ацэньваюцца на міжнародным узроўні. Гэты поспех — заслуга ўсяго калектыву, у тым ліку канталёра харчовай прадукцыі Людмілы ХАРТОЎСКАЙ і машыніста-рэгуліроўшчыка Ігара МАКАРЭВІЧА.

Сучаснае высокатэхналагічнае абсталяванне дазваляе вырабляць якасную канкурэнтаздольную прадукцыю і скарачаць выдаткі на яе вытворчасць

Калектыў ААТ «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман» віншуе з надыходзячымі Калядамі і Новым 2009 годам сваіх сяброў, партнёраў, кліентаў, пакупнікоў і жадае ўсім моцнага здароўя, жыццёвага аптымізму і новых творчых поспехаў!

Новую прадукцыю — на новым абсталяванні

Пры ўсёй грандыёзнасці задач па выхадзе з крызісу і далейшым развіцці, з ГТФ «Нёман» ніхто не здымаў абавязацельстваў па выплаце надзённых падаткаў у дзяржбюджэт, зарплаты, па аплаце рахункаў за электраэнергію і іншых рахункаў. Прыемна, што тут з усімі задачамі спраўляюцца. А яшчэ выдатна разумеюць: для таго каб паляпшаць якасць сваёй прадукцыі, неабходна замяняць старое абсталяванне на новае, высокапрадукцыйнае, якое да таго ж дазваляе зменшыць расход электраэнергіі, сыравіны і матэрыялаў на вытворчасці. Апошняй знакавай падзеяй у жыцці гродзенскай «табачкі» можна лічыць закупку ў межах чарговага этапа рэканструкцыі па замежнай крэдытнай лініі новага абсталявання германскай вытворчасці HAUNI агульным коштам 10,1 мільёна еўра. Можна смела сцвярджаць, што зараз збыліся самыя смелыя планы прадпрыемства па набыцці цыгарэтна-ўпаковачнай машыны для вытворчасці прадукцыі фармату «Супер Слім» высокага цэнавага сегмента як па кантрактнай вытворчасці з сусветнавядомымі кампаніямі, так і сваіх марак, якая дагэтуль пастаўляліся ў нашу краіну па імпарце.

На ГТФ «Нёман» лічаць, што новае абсталяванне акупіцца за 3-4 гады

Такім чынам на прадпрыемстве будзе цалкам выканана дзяржаўная праграма імпартазамяшчэння, якая была разлічана да 1 студзеня 2009 года, вынікам якой павінна стаць пранікненне прадукцыі, выпрабленай на ГТФ «Нёман» на беларускі рынак на 60—65 працэнтаў, пра што нядаўна казаў генеральны дырэктар ААТ ГТФ «Нёман» Юрый Чарнышоў. І такая сітуацыя будзе выгадная дзяржаве яшчэ і з пазіцыі спынення «ценявых» паставак, з-за якіх церпіць страты дзяржаўная казна, але і значнай эканоміі валюты.

Паводле словаў Юрыя Сцяпанавіча, пачынаючы з 2009 года, калі не трэба будзе выплачваць дзясяткі мільярдаў рублёў «запазычаных» падатковых крэдытаў, прадпрыемства пусціць гэтыя грошы на мадэрнізацыю вытворчасцю і вырашэнне розных сацыяльных задач.

Зрэшты, зараз па тэхнічна-тэхналагічным аснашчэнні ГТФ «Нёман» наўрад ці саступіць расійскім альбо ўкраінскім вытворцам тытунёвай прадукцыі, у тым ліку і па кантрактнай вытворчасці.

Сёння на фабрыцы ўстаноўлена высокатэхналагічнае нямецкае абсталяванне, якое дазваляе нам выпускаць высакаякасную прадукцыю. У маі 2007 года фабрыка закупіла новую высокапрадукцыйную цыгарэтна-ўпаковачную лінію замежнай фірмы G.D коштам 4,5 мільёна еўра. Тут палічылі, што аўчынка вырабу вартая. Асабліваясць лініі заключаецца ў тым, што яна здольная выпускаць прадукцыю ў розных варыянтах упакоўкі. Гэта дазволіла фабрыцы ў 2007-08 г.г. асвоіць вытворчасць прадукцыі трох міжнародных марак пад кантролем сусветнавядомай кампаніі «Брыціш Амерыкан Табако» (БАТ), а таксама на гэтай лініі выпусціць некаторыя новыя віды ўласнай прадукцыі ў суперсучасным афармленні.

Работніцы ГТФ «Нёман» упэўнены ў будучым прадпрыемства.

Сённяшні поспех ГТФ «Нёман» — гэта высокі прафесійны ўзровень кіраўніцтва прадпрыемства, вялікая працаздольнасць калектыву, мадэрнізацыя вытворчасці.

Гэта было даўно...

■ 6000 гадоў да нашай эры
Паводле ацэнак экспертаў, тытунёвы куст цалкам сфарміраваўся і прыняў цяперашні выгляд.

■ 600—1000 гг. да н.э. Гватэмала
Першая графічная выява курыльшчыка. Знойдзены гліняны посуд, на якім намаляваны індзеец мая, які курыць скручаныя лісты тытуню, перацягнутыя ніткай. Курэнне індзейца мая называлі «сік'ар».

■ 15 кастрычніка 1492 года тытунь быў прапанаваны Хрыстафору Калумбу амерыканскімі індзейцамі як падарунак.

■ 1497 год. Роберт Пэйн, спадарожнік Калумба ў другім падарожжы 1493 года, піша сваю першую справаздачу аб тытуні і яго выкарыстанні.

■ 1519 год. Мексіка. Картэз заваёўвае сталіцу ацтэкаў і сустракае там людзей, што курылі прататыпы нашых цыгарэт.

■ 1531 год. Санта-Дамінга. Пачынаецца еўрапейская культывацыя тытуню.

■ 1558 год. Першае з'яўленне тытуню ў Партугаліі.

■1559 год. Першае з'яўленне тытуню ў Іспаніі.

■ 1633 год. Масачусет (ЗША). Забараняецца публічнае курэнне тытуню.

■ 1634 год. Расія. Цар Аляксей уводзіць пакаранне за курэнне. Першае парушэнне — порка. Вырыванне ноздраў і ссылка ў Сібір, другое — смяротная кара.

■ 1847 год. Англія. Філіп Морыс адкрывае сваю першую тытунёвую краму, у якой прадаюцца турэцкія цыгарэты ручной скруткі.

■ 1854 год. Англія. Уладальнік лонданскага тытунёвай крамы Філіп Морыс пачынае вырабляць свае ўласныя цыгарэты.

■1861 год. Па прашэнні Лейбы Шарашэўскага створана Гродзенская тытунёвая фабрыка.

Тэхналагічны узровень створанай вытворчасці пацверджаны Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях уключэннем яго ў Рэестр высокатэхналагічных вытворчасцяў і прадпрыемстваў Рэспублікі Беларусь...

З гісторыі ГТФ « Нёман»

Архіўныя матэрыялы сведчаць, што амаль паўтара стагоддзя таму — 17 ліпеня 1861 года купец Абрам Гордан разам з Лейбам Шарашэўскім падаў прашэнне ў Гродзенскае Губернскае праўленне з просьбай адкрыць у Гродне тытунёвую фабрыку. У сувязі з тым, што Лейба Шарашэўскі не меў купецкіх правоў, дазвол на адкрыццё фабрыкі атрымаў купец Абрам Гордан. Зрэшты, на стыку XIX—XX стагоддзяў тытунёвых фабрык у Беларусі ўзнікла шмат. Пры гэтым сустракаліся і дастаткова буйныя. Напрыклад, фабрыкі віцебскага купца Арона Калбаноўскага, банкіркі Фрэйды Гінзбург у Мінску, сям'і Віленчыкаў у Мінску. Але ўсе яны недалёка адышлі ад прымітыўнай ручной перапрацоўкі тытунёвай сыравіны з Палтаўшчыны і Харкаўшчыны ў элементарную махорку для самакрутак. Шарашэўскі пайшоў далей. Атрымаўшы ў спадчыну ў 1880-х гадах невялікую вытворчасць ад свайго бацькі Лейбы, ён, дзякуючы сваім адмысловым прадпрымальніцкім здольнасцям, вывеў Гродзенскую фабрыку ў лік вядучых тытунёвых вытворчасцяў не толькі Паўночна-Заходняга краю і Польшчы, але і Расійскай імперыі. Ён першы і адзіны наладзіў вытворчасць папяросаў...

Сярэдні заробак на ААТ ГТФ «Нёман» адзін з самых высокіх у Гродзенскім рэгіёне.

На ГТФ «Нёман» працуе нямала моладзі.

ААТ ГТФ «Нёман» не толькі пацвярджае статус вытворцы высакаякаснай прадукцыі, але і строга прытрымліваецца зацверджанай стратэгіі, выконвае даручэнні кіраўніка дзяржавы і Урада Рэспублікі Беларусь па рэалізацыі праграмы імпартазамяшчэння.

НАШ АДРАС:
Рэспубліка Беларусь, 230771,
г. Гродна, вул. Арджанікідзэ, 18
www.tabak.by
e-mail: info@tabak.by
Аддзел маркетынгу:
Тэл.:+375-152-522-076; 522-074.
Тэл/факс: +375-152-522-075.
Аддзел рэалізацыі:
Тэл.:+375-152-525-206; 524-952.
Тэл/факс:+375-152-541-974.

Матэрыялы падрыхтаваў Уладзімір ЗДАНОВІЧ, фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА і з архіва прадпрыемства.

*Новую тэхніку асвойвае вопытны машыніст-рэгуліроўшчык Уладзімір **ГАРДЗЕЙЧЫК**. Гэта толькі невялікі фрагмент новай лініі. — Наша прадукцыя праходзіць строгі кантроль на дакладным аналітычным абсталяванні, — зазначыла лабарант Ірыны **ДАБРЭНКА**.*

Гэта цікава ведаць...

Фабрычны бізнэс Шарашэўскіх практычна стаў равеснікам некалькіх даволі вядомых цяпер на Захадзе і на прасторах былога Саюза фірмаў. У 1847 годзе была заснавана кампанія «Philip Morris», якая спецыялізавалася напачатку на цыгарэтах ручной скруткі з турэцкага тытуню. У 1849 годзе ў Сент-Луісе заснавана кампанія «J.E.Liggett and Brother», а ў 1850 годзе ў Яраслаўлі (Расія) пабудавана тытунёвая фабрыка «Балканская зорка», у 1902 годзе — кампанія «British American Tobbaco»...

Як відаць, традыцыі тытунёвай вытворчасці ў Гродна маюць не менш салідны тэрмін, чым у найбуйнейшых заходніх фірмаў, а высокія патрабаванні да якасці прадукцыі былі характэрны для Шарашэўскіх, бо надпіс на іх прадукцыі абвяшчаў: «Якасць супраць ранейшай значна лепшая!».

Прадукцыя фабрыкі была шырока вядомая як у Расійскай імперыі, так і за яе межамі. Прадпрыемства Л. Шарашэўскага мела таварны знак, зацверджаны ўрадам Расіі, і выпускала курыльны тытунь і табаку, папіросы, цыгары і махорку... За адносна кароткі час прадукцыя Гродзенскага прадпрыемства змагла заваяваць вялікую папулярнасць у свеце курцоў. У 1882 годзе на прамысловай выставе ў Маскве папяросы Гродзенскай тытунёвай фабрыкі атрымалі медаль Аляксандра Імператара Усерасійскага. «Серабро» было заваявана праз два гады ў Амстэрдаме і Новым Арлеане. А крыху пазней — і ў Парыжы.

■ У 1907 годзе тытунёвая фабрыка пераўтворана ў акцыянернае таварыства, яе гадавая прадукцыя ў той час склала звыш 4 мільёнаў царскіх рублёў.

Першая сусветная вайна і акупацыя горада Гродна кайзераўскімі войскамі прывялі да скарачэння і заняпаду вытворчасці.

■ 1924 год адзначаны нацыяналізацыяй фабрыкі Польшчай і звальненнем асноўнай масы рабочых. У 1929 годзе фабрыка перажывала сусветны эканамічны крызіс.

■ Пасля далучэння Заходняй Беларусі да СССР (1939 год) пачалася рэканструкцыя прадпрыемства, аднак у пачатку Вялікай Айчыннай вайны фабрыка была практычна зруйнавана, а пасля 1945 года пачалося аднаўленне прадпрыемства. Да 1980 года чвэрць стагоддзя фабрыка займала вядучае месца ў галіне.

■ У 1964 годзе ў Беларусі было створана тытунёвае вытворчае аб'яднанне «Нёман», Гродзенская тытунёвая фабрыка стала галаўным прадпрыемствам гэтага холдынгу.

У часы Савецкага Саюза фабрыка справядліва лічылася флагманам айчыннай вытворчасці ў сваёй галіне, уваходзіла ў тройку найбуйнейшых вытворцаў гэтага віду прадукцыі ў краіне.

■ 1 студзеня 1988 года аб'яднанне «Гроднатытунпрам» было ліквідавана і пераўтворана ў Гродзенскую тытунёвую фабрыку «Нёман».

■ У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб мерах па развіцці Гродзенскай тытунёвай фабрыкі «Нёман» ад 19 ліпеня 1999 года № 1106, на РУП «Гродзенская тытунёвая фабрыка Нёман» распачалася рэканструкцыя прадпрыемства, якая праводзілася без спынення вытворчасці і завяршылася ў 2002 годзе. Праўда, пасля мадэрнізацыі вытворчасці тэмпы росту прадукцыі былі вельмі павольнымі. Адбівалася запаланенне беларускага рынку танным імпартам... Сітуацыя змянілася да лепшага пасля дзяржаўнай дапамогі ГТФ «Нёман».

■ 29 снежня 2000 года ГТФ «Нёман» была зарэгістравана гродзенскім гарадскім выканаўчым камітэтам як «Рэспубліканскае вытворчае ўнітарнае прадпрыемства «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман».

ПАНЯДЗЕЛАК, 29 СНЕЖНЯ

5.30 Дак. серыял «Таямнічы свет жывёл».
6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
6.05, 7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
6.45, 7.45, 18.50, 1.00 Зона Х.
7.30, 8.25, 11.50 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.30 У свеце матораў.
9.05, 14.55 «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
9.10 Nota Bene.
9.35 Здароўе.
10.05 Жаночае ток-шоу «Жыццё як жыццё». «Позняе каханне».
11.00, 17.45 Серыял «Родныя людзі».
12.10 Дак. фільм «Мас-фільм». Невядомая версія».
13.05 Камедыя «Сцеражыся аўтамабіля».
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30 Культурныя людзі.
16.00 Гульнявое шоу «Інтуіцыя».
16.50 Серыял «Гарачы лёд».
19.35 Арэна.
19.55 Ток-шоу «Ход у адказ».
21.00 Панарама.
21.50 Навагодні тыдзень на Першым. Сольны канцэрт гурта «Новы Іерусалім».
23.05 Камедыя «Два крутыя хлопцы».
1.05 Дзень спорту.
1.15 «Будні чэмпіёнаў». Андрэй Рыбакоў.
1.45 Усе стыхіі.

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00, 1.20 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.10 «Шчаўкунок: прынц арэхаў».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.15, 1.35 Навіны спорту.
11.10 «Кантрольная закупка».
11.50 «Малахаў+».
13.10 «Зразумець. Дараваць».
13.45 «Модны прыгавор».
15.00 «Зорная радня».
16.15 «Пасаг для нявесты». Фінал.
17.45 «Жарт за жартам».
18.20 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».
19.00 Чакай мяне.
20.00 Час.
21.05 «Песня года Беларусі-2008». Частка 1.
23.20 Маст. фільм «Снежны анёл».

6.55 Ранішняя падзарадка.
7.55, 17.00 Смачна з Барысам Бурдой.
8.25 Тэлебарометр.
8.45 Усё аб бяспецы.
9.10 У гэты дзень.
9.15, 16.10 Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
10.00 Баявік «Сахара».
12.15 Слова пісьменніка.
12.45 Серыял «Расплата за грахі».
13.35 Бухта капітанаў.
14.15 Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць».
15.05 Пазакласная гадзіна.
15.20 Гіпноз.
17.30 Серыял «Спадчынніца».
18.35 Навіны культуры.
18.50 Серыял «Забойная сіла-1».
21.10 Калыханка.
21.35 Камедыя «Мы з джаза».
23.20 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
0.20 Хакей. Формула гульні.

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 7.40 «Раніца. Студыя добрага настрою».
8.30 «Тыдзень».
9.30 «Вялікае снеданне».
10.05 «Дарагая перадача».
10.40 «Наша справа».
10.50 Фільм-казка «Казкі старога чараўніка».
13.10 «Далёкія сваякі».
13.50 «Мой дом».
14.20 «Горад дзяцінства».
14.35 «Крутыя хлопцы і дзяўчаты». Фінал.
16.00 «Культурнае жыццё».
16.50 «Спартыўны тыдзень».
17.20 «Міншчына».
17.30 Маст. фільм «Імяніны».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.10 «Добры вечар, малы».
20.30 Маст. фільм «Снягурка для дарослага сына».
22.55 «Салдаты. Новы год, тваю дывізію».
0.30 «Закон і крымінал».
0.35 «Сталічны футбол».
1.05 «Ледаколы». Канцэрт гурта «J-МОРС».

5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00 Навіны Садружнасці.
5.05, 6.05, 7.05, 1.05, 2.30 Садружнасць live.
5.30 «Жаночы часопіс».
6.35 «Удачная пакупка».
6.45 «Цік-так».
7.30, 19.30 «Агульны інтарэс».
8.05, 1.30 Дак. серыял «Падводная адысея каманды Кусто».
9.05 «Разам».
10.05 Маст. фільм «Плачу наперад».
12.05, 23.20 Маст. фільм «Хто паедзе ў Трускавец».
14.05 Мультсерыял «Блізняты Крамп».
14.30 Серыял «Робін з Шэрвуда».
15.20 Дак. серыял «Купаючыся ў раскошы».
15.55 «Білет на сёння».
16.05, 4.00 «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
17.05 Серыял «Каханне як каханне».
18.20 Акцэнты.
18.30 Серыял «Па матывах расказаў В. Шукшына». 1-я серыя.
20.05 Ток-шоу «Слова за слова».
21.20, 3.00 «Дакументальны дэтэктыў. Раніцай загіне горад».
22.30 Дак. фільм «Кома гэта праўда».

7.00, 10.50, 16.55 «Навіны кіно».
7.10 «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
7.25, 23.30 «Метэапрагноз».
7.30 Камедыя «Вясёлыя святы».
9.00 «Навука і рэлігія — ад канфлікту да дыялогу». Беларускі вопыт.
9.30 «К-відэа для дзяцей».
9.50 Серыял «Служба расследаванняў».
11.00 Серыял «Сям'я Кардзье».
12.45 «8 самых».
13.00 «Дзённы тэлечат».
16.30 Мультпарад.
17.00 Серыял «Сваволнікі».
17.30 Серыял «Лейтэнант Каломба».
19.15 «Мой любімы гадаванец».
19.45 Серыял «Вялікі перапынак».
20.55 «Вечарніца».
21.10 «К-відэа» для ўсёй сям'і.
21.15 Трылер «Вораг мой».
23.10 «Стары магнітафон».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.15 Маст. фільм «Замры, памры, уваскрэсні».
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.20 Серыял «Расійская імперыя. Пачатак». Фільм 3-і. «Павел». 2-я серыя.
12.30 Дэтэктыў «Тэрыторыя». 1993 г. 1-я серыя.
13.50, 16.50, 18.50, 0.00 Навіны—Беларусь.
